КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 25 (201)
◂ 2 ліпеня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**РАЗУМЕННЕ КАНСТЫТУЦЫІ ПА-ЎКРАІНСКУ**

Стар. 5

**ЦІ ЛЮБЯЦЬ ГРУЗІНЫ СТАЛІНА?**

Дэмантаж помніка Сталіну на яго радзіме ў горадзе Горы выклікаў шырокую палеміку наконт цяперашняга стаўлення грузін да асобы правадыра народаў

Стар. 13

**БЕЗ НАРВІЛІШАК ГЭТА БУДЗЕ НЕ «BE2GETHER»**

Сотні аматараў музыкі з Беларусі, Літвы і прылеглых да іх краінаў сабраліся на вялікім полі, каб увасобіць галоўную ідэю мерапрыемства — роўнасць і еднасць

Стар. 14

**УВЕСЬ ГЭТЫ РОК**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЭЛІТА ЎМОЎНАЯ І САПРАЎДНАЯ**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ З НАГОДЫ

# Майкл Скэнлан: АСНОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ЗАСТАЮЦЦА НЯЗМЕННЫМІ

**Год таму, 30 чэрвеня 2009 года, у Беларусь у якасці Часовага паверанага ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі прыехаў Майкл Скэнлан. Кадравы дыпламат, які папрацаваў у шмат якіх краінах свету. Якім быў гэты год для Майкла Скэнлана і для амбасады ЗША? Пра гэта з Часовым паверанным у справах Злучаных Штатаў Амерыкі размаўляе галоўны рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль.**




*— Спадар Скэнлан, як Вам у нас? Якія ўражанні?*

— На жаль, умовы, у якія была пастаўлена наша амбасада ў Беларусі, абмяжоўваюць мае магчымасці знаёмства з жыццём і людзьмі вашай краіны. Я ніколі не працаваў у амбасадах, дзе толькі пяць супрацоўнікаў. Калі я расказваю пра гэта сваім калегам, яны не могуць такое ўявіць. У нас выключна напружаны працоўны графік, што сур'ёзна скарачае мае магчымасці вандраваць па Беларусі і сустракацца з людзьмі.

Акрамя таго, нашы перамяшчэнні па Беларусі абмежаваны саракакіламетровай зонай. Такім чынам, калі ў выходныя нехта з сяброў ці знаёмых скажа: «Майкл, хочаш далучыцца да мяне з сябрамі на шашлык на прыродзе?» — я мушу запытацца, а ці ўваходзіць гэта месца ў саракакіламетровую зону ад цэнтра Мінска, якой мы абмежаваныя, калі не пададзім за 24 гадзіны дыпламатычную ноту.

Аднак нягледзячы на гэта, я езджу па Беларусі. Мінулай зімой калі-нікалі катаўся на сноўбордзе, зрэдку атрымлівалася выбрацца пагуляць у тэніс, схадзіць у кіно. Апошнім часам удалося паглядзець шэраг цікавых гульняў Чэмпіянату свету па футболе.

Дзякуючы гэтаму я лепш пазнаёміўся з Беларуссю, яшчэ раз пераканаўся, што ў людзей заўсёды знойдуцца агульныя інтарэсы і супадаючыя захапленні. І гэта цудоўна, бо нагадвае, што трэба заставацца чалавекам і атрымліваць асалоду ад жыцця.

Я ўдзячны беларусам, якіх ведаю, з якімі я пазнаёміўся не толькі па працы, і з якімі я магу добра бавіць вольны час.

***— Вы закранулі тэму ўмоў працы амбасады ЗША ў Беларусі. Але нядаўна пры адкрыцці фотавыставы «Амерыка вачыма беларусаў» у Нацыянальнай бібліятэцы ў Вашым выступе прагучала аптымістычная нотка — спадзяванне на пашырэнне штату амбасады. Гэты аптымізм на чымсьці грунтуецца?***

— У дадзеным выпадку я зыходзіў не з аптымізму, а з вядомага выслоўя, якое часта чую тут: «Надзея памірае апошняй». На жаль, ніякіх сігналаў з боку беларускага ўраду не было, нягледзячы на тое, што мы пастаянна гатовыя да пашырэння дыялогу і супрацоўніцтва ў розных сферах.

***— У гэтым кантэксце лагічна запытацца пра пераемнасць палітыкі адміністрацыі Барака Абамы з палітыкай папярэдняй адміністрацыі ў адносінах да Беларусі?***

— Пытанне: «У чым палягае новая палітыка?» — адно з найбольш папулярных пытанняў прэсы. У многіх аспектах сапраўды ёсць змены, таму што людзі выбіраюць новага прэзідэнта і, адпаведна, новую адміністрацыю менавіта дзеля перамен. Аднак знешняя палітыка ЗША грунтуецца на шэрагу галоўных прынцыпаў, у прыватнасці такіх, як захаванне правоў чалавека. Гэта канстанта. Могуць быць адрозненні ў падыходах, але асноўныя каштоўнасці застаюцца нязменнымі.

Калі мы паглядзім на палітыку папярэдняй і цяперашняй адміністрацыяй у адносінах да Беларусі, дык мы ўбачым, што тут усё ясна і проста. Пытанне правоў чалавека і пытанне наконт прымянення санкцый злучаны паміж сабой, яны ў адной упакоўцы. Гэта простае матэматычнае ўраўненне. Калі сітуацыя з правамі чалавека паляпшаецца — санкцыі памяншаюцца. І наадварот. Але, як гэта было і раней і ёсць цяпер, трэба акцэнтаваць увагу на тых сферах, дзе мы можам знайсці агульныя інтарэсы, сумесна працаваць, каб перадолець складанасці і перашкоды глабальнага ўзроўню. У прыватнасці, у такіх сферах, як нераспаўсюд зброі, пашырэнне культурных і адукацыйных абменаў, навуковыя даследаванні, абмен досведам і ведамі па сацыяльных пытаннях і пытаннях аховы здароўя, барацьба з транснацыянальнай злачыннасцю, гандлем людзьмі. Гэта пашырэнне свабоднага абмену інфармацыяй, каб людзі маглі лепш адзін аднаго ведаць.

Адказу ад беларускага ўрада мы не пачулі. Мы як былі, так і застаёмся адкрытымі ў гэтых галінах. І рашэнне будзе залежыць толькі ад вашага ўраду.

Усё, што мы робім, мы робім у цесным і адкрытым супрацоўніцтве з Еўропай. Гэта была паслядоўная палітыка ў адносінах да Беларусі на працягу болей чым дзесяці апошніх гадоў, і такой яна застаецца.

***— Нядаўна ЗША прынялі рашэнне наконт працягу санкцый у адносінах да пяці беларускіх чыноўнікаў. Гэта можна лічыць пацвярджэннем пераемнасці палітыкі і адказам на тое, што ў палітыцы Беларусі не адбываецца ніякіх пазітыўных зрухаў?***

— Гэта звязана з сітуацыяй з правамі чалавека, з незалежнымі сродкамі масавай інфармацыі, са свабодай дзейнасці грамадскіх асацыяцый, правядзеннем свабодных і празрыстых выбараў. Гэта ўсё звязана з санкцыямі. Гэта сістэма, працэс, у якім для нас няма фаварытаў. І які, у яго дэмакратычным фармаце, дазволіў бы беларусам прымаць рашэнні пра ўладкаванне свайго жыцця самастойна.

Напачатку 2009 года было адчуванне, што сітуацыя з правамі чалавека сапраўды паляпшаецца. Як вынік, ЗША і Еўрапейскі саюз крыху зменшылі санкцыі. Памочнік дзяржаўнага сакратара ў жніўні 2009-га прыехаў у Мінск, каб яшчэ раз падкрэсліць тры асноўныя прынцыпы нашай знешняй палітыкі ў адносінах да Беларусі, а таксама важнасць дыялога, вынікам якога стала б паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека і адпаведнае змяншэнне санкцый.

Але, на жаль, гэтага не адбылося, і вы памятаеце нашу заяву ў лістападзе 2009 года, у якой гаварылася, што сітуацыя з правамі чалавека захавалася нязменнай і, такім чынам, нязменнымі засталіся і нашы санкцыі: яны не змякчыліся і не ўзмацніліся.

Працяг на стар. 4 ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ЖЛОБАЎЦЫ. АКУЛЬТУРЫЛІ РАДЗІМУ ПАЭТКІ

У мінулыя выходныя на хутары, дзе нарадзілася знакамітая беларуская паэтка Ларыса Геніюш, адбылася талака. Яна была прысвечана стагоддзю са дня яе народзінаў. У ёй прынялі ўдзел грамадскія актывісты Ваўкавыска, Гродна, Свіслачы, Зэльвы, Мастоў і Мінска. Арганізатарам мерапрыемства выступіў Мікола Кавальчук з Ваўкавыска. Сваёй руплівасцю ён адшукаў будынак, які ў яго горадзе складзены з бярвёнаў жлобаўскага дома Геніюш. На месцы хутара засталіся толькі камяні фундамента. Удзельнікі талакі павысякалі кусты, скасілі траву, акультурылі былое падвор'е.

### МЁРЫ. КНІГА ПРА БАЛОТА

Плёнам шасцігадовай працы навукоўцаў стала грунтоўная, першая ў Беларусі публікацыя пра балота. Называецца кніжка «Флора і расліннасць рэспубліканскага заказніка «Ельня».

Суаўтарам кнігі стаў гродзенскі біёлаг Алег Созінаў, які абышоў дзвацаць тысяч гектараў, каб напісаць раздзел «Флора». Навукоўцы з некалькіх навучальных устаноў зрабілі сапраўды вялікую справу. Апісалі балота, якое мае ўзрост большы за 8 тысяч год. Важнасць гэтага апісання вялікая, як значнасць балота, бо Ельня — важная для птушак (ТВП) тэрыторыя міжнароднага значэння, Рамсарскае ўгоддзе. Тут жывуць каля 100 відаў птушак, 23 з якіх занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. Балотны масіў мае вялікае значэнне для тысяч гусей і жураўлёў, якія мігруюць падчас веснавога і восеньскага пралётаў.

### КЛЕЦК. ПАКУТНІК АБ'ЯДНАЎ НАРОДЫ

Па ініцыятыве каталіцкага касцёла «Святой Троіцы» з нагоды кананізацыі і прылічэння да ліку святых Вялікага мужа славянскіх народаў Беларусі, Польшчы, Украіны, Расіі адбылося набажэнства ў гонар Святога Зыгмунта Фялінскага, які мае паходжанне з роду Вендорфаў, гістарычна звязанага з Ганцаўшчынай. Акрамя імшы, прайшоў сімпозіўм пра значнасць гэтай гістарычнай асобы. Яго ўдзельнікам была арганізавана экскурсія на месца жыхарства і пахавання сям'і Вендорфаў у вёсцы Ясянец Ганцавіцкага раёна. На імпрэзе прамаўлялі прадстаўнікоў Варшавы, Глыбокае, Санкт-Пецярбурга, вучоныя Беларусі. Былі касцельныя спевы, канферэнцыя ў Дольным касцёле і іншае.

### ІВЯНЕЦ. ЦУКЕРКАВЫ ФЭСТ

СП «Іўкон» ААТ надумала адрадзіць старадаўні беларускі звычай летніх фэстаў і наладзіла першы цукеркавы фестываль «IVKON». Уся мастацкая яго частка была пабудавана на мясцовых паданнях з прыцягненнем сталічных калектываў — гуртоў «Рада», «Гуда», «Дзівасіл» і іншых. Не згубіліся сярод прафесіяналаў, сказалі сваё адметнае музычнае слова і тытулаваны Ракаўскі «Гасцінец», і пакуль што менш вядомы гурт Івянецкай музычнай школы «Рарог». Аднак дамінантная роля адводзілася вырабам « Іўкона» — разнастайным цукеркам і іншым прысмакам. Да падзеі нарадзілася фестывальная песня, словы якой напісала Антаніна Хатэнка, а музыку — Зміцёр Вайцюшкевіч.

## ▸ СВЯТА

# КУПАЛЛЕ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ

Іван БАРЫСАЎ

**Згодна добрай традыцыі, якая існуе ўжо некалькі гадоў, прыхільнікі захавання народных традыцый з розных куткоў Беларусі сабраліся ў Бялыніцкім раёне, каб адзначыць старажытнае свята Купалля з 24 па 27 чэрвеня.**

Святкаванне праходзіць у вельмі маляўнічым і жывапісным месцы Бялынiччыны непадалёк ад вёскі Гута на рацэ Друць. Ініцыятарам і арганізатарам святкавання, з самага пачатку адраджэння народных традыцый на Бялынiччыне, выступае даўні прыхільнік беларушчыны, прадпрымальнік з Бялыніч Алег Мяцеліца. Вялікую дапамогу ў арганізацыйных пытаннях аказвае Ірына Тоўсцік.

«Звычайна ў нас збіраецца да сотні чалавек. — расказвае Алег Мяцеліца. — Людзі прыязджаюць цэлымі сем'ямі, з дзецьмі, каб адзначыць свята Купалля, узгадаць старажытныя традыцыі нашых продкаў, ды і проста цудоўна адпачыць. Хтосьці ўдзельнічае ў святкаванні адзін дзень, хтосьці прыязджае за некалькі дзён да пачатку асноўнага мерапрыемства і застаецца адпачыць на прыродзе пасля яго афіцыйнага заканчэння. Вольны час бавім весела і з вялікім задавальненнем. Для дзяцей ладзяцца розныя цікавыя мерапрыемствы (дарэчы, ужываць спіртныя напоі ў лагеры забаронена). Дарослыя могуць наведаць лясную лазню альбо паплаваць па рацэ Друць на каноэ, паслухаць выступленні музыкаў. Кожны вечар, згодна старадаўняму, яшчэ з часоў паганства абраду, запальваюцца вялікія вогнішчы, ля якіх спяваюць народныя песні, ладзяцца разнастайныя цікавыя гульні. Кульмінацыяй свята стаў вечар у суботу, калі мы варылі крупнік, палілі вогнішча. Пасля, згодна старадаўняй народнай традыцыі, дзяўчаты пусцілі вянкі са свечкамі па рацэ Друць, каб даведацца, хто будзе наканаваны лёсам ім у жаніхі».

## ▸ ЗВАРОТ

# НЕ ТРЭБА ЦУРАЦЦА РОДНАЙ МОВЫ

**Сакратарыят Таварыства беларускай мовы прыняў зварот, у якім адзначае небяспечную тэндэнцыю на «ігнараванне дзяржаўнай беларускай мовы пры агучванні ў СМІ сваіх праграмаў, заяў і платформаў» рознымі партыямі і рухамі, прэтэндэнтамі ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта на будучых выбарах.**

«І гэта адбываецца, — гаворыцца ў звароце, — у той час, калі ўвесь народ Беларусі разумее па-беларуску, а большая палова ставіцца да ўжывання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця станоўча. Самае цікавае, што амаль усе вылучэнцы цудоўна разумеюць, што сапраўднымі кандыдатамі яны не стануць і сто тысяч подпісаў грамадзян Беларусі ў сваю падтрымку не збяруць. Руская мова тут ім толькі перашкодзіць, бо сапраўдныя патрыёты іх не падтрымаюць, а прыхільнікі ўлады іх улёткі проста не будуць чытаць.

Значыць, яны хочуць спадабацца тым палітычным і фінансавым групоўкам на Усходзе і на Захадзе, якія ў сваіх інтарэсах падтрымліваюць русіфікацыю Беларусі. Таму ці варта верыць такім дэмакратам? З беларускім народам трэба гаварыць па-беларуску».

**Паводле інфармацыі сакратарыята ТБМ**

## ▸ СМУТАК

# ПАМЯЦІ АЛЬГІРДАСА БРАЗАЎСКАСА

*Аляксей КАРОЛЬ*

**26 чэрвеня на 78-м годзе жыцця пасля цяжкай хваробы ў Вільнюсе памёр былы прэзідэнт Літвы Альгірдас Бразаўскас.**



**Даведка**

У 33 гады Бразаўскас стаў міністрам прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Літоўскай ССР. У канцы 1980-х гадоў узначальваў Кампартыю Літвы, якая пад яго кіраўніцтвам падтрымала курс рэспублікі да незалежнасці. У 1993–1998 гадах быў прэзідэнтам Літвы, у 2001–2006 гадах — прэм'ер-міністрам.

«Мы страцілі вялікага чалавека, выбітнога палітыка і шчырага сябра, які ўзяў на сябе адказнасць у адзін з самых цяжкіх момантаў у гісторыі Літвы», — гаворыцца ў паведамленні, размешчаным на сайце Сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы, якую Бразаўскас у свой час узначальваў.

Смуткуе не толькі партыя, якую ён стварыў. Смуткуе ўся Літва. Не толькі паплечнікі, але і палітычныя канкурэнты, не толькі прыхільнікі, што галасавалі на выбарах за яго, але і тыя, хто галасаваў за іншых. Бо ўсе разумеюць — сышоў палітык, чыё імя ўвасобіла сабой цэлую эпоху ў гісторыі Літвы, у гісторыі літоўскага народа, а значыць, і ў лёсе кожнага.

Сапраўды вялікі палітык, чыімі дзеяннямі Літва сцвердзілася як незалежная дзяржава, як дэмакратычная дзяржава. І ўвайшла ў еўрапейскую супольнасць. Эпоха, якая не завяршылася з яго сыходам, а мае свой працяг і будзе доўжыцца да бясконца. Гэта ён ужо ведаў пры жыцці. Рэдкае шчасце для палітыка — бачыць поспех сваёй справы.

Не кожнаму палітыку выпадае такі гістарычны шанец. Але толькі выбітны палітык здольны з апярэджаннем успрыняць сігнал часу і не ўпусціць не тое, што свой шанец, але шанец для свайго народа, сваёй краіны.

І якую ж трэба мець моц мыслення, патрыятызму і палітычнай інтуіцыі, каб пачуць і зразумець гэты выклік часу, займаючы кіроўныя пазіцыі ў зусім іншай сістэме каардынатаў — таталітарнай сістэме, прычым часткі вялікаімперскай сістэмы.

Без Бразаўскаса гісторыя Літвы найноўшага часу была б іншай.

Разам з тым Альгірдас Бразаўскас — фігура для параўнання палітычных магчымасцей для нашай краіны. На жаль, у Беларусі не знайшлося ў патрэбны час свайго Бразаўскаса. І тады б гісторыя найноўшага часу Беларусі была б іншай. Гэтай думкай мне ўдалося падзяліцца з самім Бразаўскасам, з якім пашчасціла сустрэцца і пагаварыць на пачатку 1990-х, калі ён прыязджаў у Мінск, і ў 2006-м — на юбілейных урачыстасцях яго партыі ў Вільнюсе. Пагаварыць аб страчаных магчымасцях і абмеркаваць перспектывы дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі. З яго перакананнія — непазбежных.

## ▸ ПАКАЗЧЫКІ

# ЗАДАННЕ НЕ ВЫКОНВАЕЦЦА

Ірына БЕГАНКІНА

**Ні адзін з раёнаў Магілёўскай вобласці не выканаў прагнознае заданне па павелічэнню вытворчасці малака за студзень-май 2010 года.**

Як паведамляе інтэрнэт-сайт Магілёўскага аблвыканкама, валавы надой малака ў сельскагаспадарчых арганізацыях Магілёўскай вобласці ў студзенімаі павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам на 12,6 тыс. тон, або на 4,6%.

Адзначаецца, што вытворчасць малака павялічылася ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці. Найвялікшы прырост адзначаецца ў Асіповіцкім і Клімавіцкім раёнах — 9,5% і 7,8% адпаведна.

Здаецца, можна толькі парадавацца за дасягнутыя вынікі, але нашы шаноўныя калегі з БЕЛТА забыліся на тое, што, згодна заданне для Магілёўскай вобласці на 2010 год, рост вытворчасці малака запланаваны на 14%. І калі запланаванага павелічэння вытворчасці не атрымаецца дасягнуць у найбольш «малочныя» летнія месяцы, то наўрад ці гэты паказчык будзе выкананы па выніках года.

Яшчэ больш сумныя вынікі з рэалізацыяй малака. За пяць месяцаў 2010 года па ўсіх каналах збыту рэалізавана 235,1 тыс. тон малака, што склала 81,6% ад яго вытворчасці супраць 83,1% за аналагічны перыяд мінулага года. Найбольш высокая ўдзельная вага рэалізаванага малака ў Хоцімскім (86,9%) і Кіраўскім (86,1%) раёнах, найменшая — у Краснапольскім (69%) і Круглянскім (72,5%) раёнах.

Нізкай таварнасці малака ў Магілёўскай вобласці ёсць простае тлумачэнне: з-за пастаяннага ціску «вертыкалі» наконт безумоўнага выканання прагнозных паказчыкаў кіраўнікі гаспадарак і спецыялісты заатэхнічнай службы папросту вымушаны ісці на «прыпіскі» надояў. Потым гэта, атрыманае на паперы малако, на гэтай жа паперы выпайваецца жывёле. Рэалізацыю ж малака так проста не прыпішаш.

Прычым усе чыноўнікі ад сельскай гаспадаркі гэту схему выдатна ведаюць, але заплюшчваюць вочы, бо прагноз трэба выконваць любымі метадамі, інакш можна і пасаду згубіць.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗАПАРОЖЦЫ ПІШУЦЬ ЛІСТ ТУРЭЦКАМУ СУЛТАНУ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Не, канешне, не запарожцы. І не турэцкаму султану. Аднак апошнія падзеі нагадваюць знакамітую карціну. Хаця, зважаючы на твары запарожцаў на малюнку, там не абышлося без нецэнзурных выразаў. Аляксандр Лукашэнка абышоўся без іх. Або яны былі зарэзаны цэнзурай.**

Кіраўнік Беларусі звярнуўся да эпісталярнага жанру. Ягоны ліст быў надрукаваны ў камуністычнай газеце Расіі «Праўда», а затым ён даў інтэрв'ю CNN.

У прыватнасці, Лукашэнка лічыць, што страта Беларусі для Расіі стане непапраўным уронам. Ён адзначыў, што калі Расія будзе і надалей весці падобным чынам сваю палітыку, Беларусі будзе «крыху складаней». «Такая палітыка з боку Расіі прывядзе да вельмі дрэнных наступстваў для самой Расійскай Федэрацыі», — заявіў Лукашэнка CNN.

«Але я не думаю, што ў Расіі гэта афіцыйна прызнаны курс і што яна будзе ісці гэтым курсам. У адваротным выпадку Расія страціць Беларусь, а гэта будзе непапраўны ўрон, найсур'ёзнейшы ўрон маральны, матэрыяльны, ваенна-палітычны, калі разглядаць любы аспект — гэта вялікая страта для Расіі», — адзначыў беларускі кіраўнік.

Што тычыцца «Праўды», то там лейтматыў ліста такі ж самы. «Давайце будзем шчырымі: няўжо за дзеяннямі «Газпраму» ва ўсёй гэтай гісторыі ляжыць толькі грашовы інтарэс? Хіба ж пара соцень мільёнаў долараў можа быць вырашальнай для фінансавага становішча адной з найбуйнейшых транснацыянальных карпарацый? Упэўнены, што для ўсіх адказ відовы», — піша беларускі прэзідэнт.

Падаплёка канфлікту, на думку Лукашэнкі, абсалютна ў іншым: «Ён толькі частка той недружалюбнай палітыкі, якая на працягу апошніх гадоў планамерна праводзіцца ў адносінах да Беларусі. Дастаткова ўспомніць нядаўнія «малочныя», «мясныя», «цукровыя», «нафтавыя» і іншыя войны. Я ўжо не кажу пра тую лінію, якую мэтанакіравана праводзіць большасць расійскіх СМІ і якая набыла характар сапраўднай інфармацыйнай агрэсіі».

Аўтар ліста мяркуе, што мэта відавочная: «пастроіць» кіраўніцтва Беларусі, прымусіць пайсці на саступкі ва ўрон нацыянальным інтарэсам суверэннай дзяржавы, атрымаць смачныя кавалак беларускай уласнасці.

«Мы ў Беларусі ўсё гэта бачым і ацэньваем адпаведным чынам. Як вынік — сярод нашых грамадзян, на жаль, становіцца ўсё менш прыхільнікаў глыбокай інтэграцыі з Расіяй. Беларусы пачынаюць ставіцца да самай блізкай для нас краіны — Расіі — з насцярожанасцю, чакаючы ад яе самых непрадказальных удараў», — сцвярджае Лукашэнка.

Ці сапраўды гэтыя тэксты выкліканыя «газавай вайной»? Хутчэй за ўсё, не. Хутчэй за ўсё, «газавая вайна» толькі абвастрыла ўспрыняцце беларускага прэзідэнта — успрыняцце чутак пра тое, што Крэмль на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах яго не падтрымае. Таму Лукашэнка задзейнічаў інфармацыйны рэсурс па звыклай схеме: звярнуцца, па-першае, да расійскіх апазіцыянераў (КПРФ), і, па-другое, на Захад. Прычым, звыклы тэлеканал пад назвай «Еўраньюс» для яго ўжо «не каціць». Ён звярнуўся да тых, хто па-ранейшаму лічыцца ворагам Беларусі — да амерыканцаў з CNN. Пры тым, што дыпламатычны канфлікт 2008 года, калі колькасць супрацоўнікаў амерыканскай амбасады ў Беларусі была значна скарочаная, дагэтуль не ўладжаны.

Што гэта значыць? Гэта яўны пасыл Расіі, што яна можа згубіць у Беларусі ўсё. Дзве вайсковыя базы (у Вілейцы і Баранавічах), аэрадромы «падскоку» (больш за 10 штук, дзе расійскія ядзерныя бамбардзіроўшчыкі маглі б дазапраўляцца), супрацьпаветраны «шчыт Масквы». Ну, і іншыя гіпатэтычныя выгоды, кшталту прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, Мытнага саюза і гэтак далей.

Але сам зварот да «Праўды» можа мець значныя наступствы. Лукашэнка звяртаецца да расійскай апазіцыі ў той час, калі ўсім у Расіі «руліць» «Адзіная Расія». Дарэчы, вельмі трапна назва гэтай партыі гучыць на беларускай мове. «Адзіная» па-беларуску можна перакладаць і як «Единая», і як «Единственная». І зварот Лукашэнкі да канкурэнта — газеты КПРФ, — можа выклікаць вельмі моцнае раздражненне ў Крэмля.

Дарэчы, яшчэ адным «званочкам» да Расіі можа быць і актыўнасць пошуку інвестыцыйных праектаў у беларускую эканоміку. Беларусь і Літва маюць намер сумесна рэалізаваць праект па будаўніцтве тэрмінала па разрэджванні газу, паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі 28 чэрвеня падчас адкрыцця ў Мінску гіпермаркета «Ома», пабудаванага з удзелам літоўскага капіталу. Паводле экспертаў, кошт на звадкавы газ з Катара складае 145 долараў за тысячу кубаметраў, у той час як «Газпрам» плануе нам прадаваць яго за 250 долараў.

Урад Беларусі 29 чэрвеня ў Мінску падпісаў інвестыцыйны дагавор са швейцарскай кампаніяй «Франк Мюлер» аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Абнаўленне вытворчасці і прадукцыі ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод». Паводле слоў гендырэктара «Франк Мюлер» Вартана Сірмакеса, аб'ём інвестыцый складзе больш як 10 мільёнаў долараў. Першая партыя новых гадзіннікаў «Прамень», як чакаецца, з'явіцца ў сакавіку наступнага года.

Да канца чэрвеня Беларусь падасць Кітаю прапановы аб стварэнні ў краіне высокатэхналагічных вытворчасцей з удзелам кітайскага капіталу. Пра гэта на сустрэчы з намеснікам міністра камерцыі Кітая Гао Хучэнам 29 чэрвеня ў Мінску паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

Ён нагадаў пра дамоўленасці з кітайскім бокам аб пераносе высокатэхналагічных кітайскіх вытворчасцей на тэрыторыю Беларусі для стварэння магутнай прамысловай зоны. «Гэта праекты, якія заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі», — падкрэсліў Сідорскі. Паводле слоў кіраўніка ўрада, беларускі бок ужо падрыхтаваў прапановы аб рэалізацыі праектаў у 12–13 галінах эканомікі, «дзе кітайскія інвестары маглі б стварыць прадпрыемствы».

Акрамя таго, найбліжэйшым часам кітайскім партнёрам будзе пададзены маштабны праект па развіцці транспартнай інфраструктуры ў беларускай сталіцы з аб'ёмам інвестыцый 500 мільёнаў долараў.


http://gazeta-pravda.ru/content/view/5050/34/

P2P News Work WaReZ Torrents IT Cool SharePoint 1C "Все Диски" - мински...

ТЫ ПОДПИСАЛСЯ?

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ПРАВДА

Газета основана 5 мая 1912 года В. И. ЛЕНИНЫМ

КОММУНИСТИЧЕСКАЯ ПАРТИЯ РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ

Свежий номер › Свежий номер › Внести ясность

Главная | Подписка | Реклама | Контакты | Ссылки

поиск... Ok

- Свежий номер
- Полосы
- Архив
- Расширенный поиск
- Рабочее движение
- Движение женщин России
- Болог статей

Всего посетителей: 0939263

Сегодня 5850

Вчера 6803

**Внести ясность**

Автор: Александр ЛУКАШЕНКО.

28.06.2010

***Главному редактору газеты «Правда» Б.О. КОМОЦКОМУ***
***Минск, 28 июня 2010 года***

Уважаемый Борис Олегович!
Считаю необходимым проинформировать Вас о реальной ситуации, сложившейся по так называемому газовому конфликту между Республикой Беларусь и Российской Федерацией.
Это обусловлено тем, что в течение последней недели гражданам наших стран и всему мировому сообществу российскими политиками и СМИ активно навязывался искаженный взгляд на данный вопрос.
Каково же истинное положение дел?

Действительно, за истекший период текущего года образовалась задолженность ОАО «Белтрансгаз» перед ОАО «Газпром» в размере 186,7 млн. долларов США. Это было вызвано тем, что, оплачивая газ по цене 2009 года,

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДР ЯРАШУК



Лідэр Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) Аляксандр Ярашук абраны віцэ-старшынёй Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў (МКП).

Як паведамляе прэс-служба БКДП, другі з'езд Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў праходзіў з 21 па 25 чэрвеня ў Канадзе. У працы форуму ўдзельнічалі больш за тысячу дэлегатаў, у тым ліку прэм'ер-міністр Грэцыі Георгіус Папандрэу, прэзідэнт Аргенціны Крысціна Кіршнер, дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Даменік Строс-Кан, генеральны дырэктар Сусветнай гандлёвай арганізацыі Паскаль Ламі.

«Прычынай і вынікам крызісу стаў не толькі дэфіцыт фінансавых рэсурсаў. Значна больш важна, што з'явіўся велізарны попыт на такі унікальны тавар, як справядлівасць. Тавар, эксклюзіўным вытворцам якога з'яўляемся мы, прафсаюзы. Тавар, рост каціровак якога прызнае нават Міжнародны валютны фонд», — падкрэсліў у сваім выступленні на з'ездзе МКП Аляксандр Ярашук.

Міжнародная канфедэрацыя прафсаюзаў — найбуйнейшае міжнароднае аб'яднанне прафсаюзаў, якое прадстаўляе інтарэсы больш чым 176 мільёнаў працоўных, аб'ядноўваючы 312 прафцэнтраў з 155 краін і тэрыторый усіх кантынентаў. БКДП з'яўляецца сябрам МКП з 2003 года.

### ТЭРЭСА СОБАЛЬ



У доме актывісткі неафіцыйнага Саюза палякаў на Беларусі (СПБ) Тэрэсы Собаль у Івянцы (Валожынскі раён Мінскай вобласці) раніцай 28 чэрвеня прайшоў вобыск.

Як паведаміў БелаПАН старшыня галоўнага савета грамадскага аб'яднання Анджэй Пачобут, вобыск праводзіўся ў межах крымінальнай справы, распачатай у дачыненні да актывісткі СПБ 18 снежня 2009 года. «Собаль абвінавачваецца ў злоўжываннях пасля атрымання ў 2004 годзе матэрыяльнай дапамогі ад кіраўніцтва СПБ. Аднак, як я лічу, крымінальная справа распачата па палітычных матывах, для дыскрэдытацыі Тэрэсы Собаль у вачах сябраў Саюза палякаў і беларускай грамадскасці», — заявіў Пачобут.

Паводле яго слоў, 24 лютага начальнік следчага аддзела Валожынскага РАУС Мінскай вобласці Аляксандр Шульга спыніў гэту крымінальную справу ў сувязі з заканчэннем тэрміну даўніны. Аднак, як выявілася, той жа самы Шульга аднавіў крымінальную справу і падпісаў ордэр на вобыск дома Собаль і падсобных памяшканняў. «Супрацоўнікі міліцыі шукалі, як вынікае з пастановы аб вобыску, «прылады злачынства» — камп'ютэры і носьбіты інфармацыі. Але нічога падобнага не знайшлі.

Аднаўленне крымінальнай справы ў дачыненні да актывісткі СПБ ён расцэньвае як «відавочную палітычную замову ўлады, скіраваную на тое, каб дэмаралізаваць сябраў неафіцыйнага Саюза палякаў на Беларусі».

### АНДРЭЙ КУРЭЙЧЫК



На Біенале еўрапейскага тэатра, якая праходзіла ў Германіі з 17 па 27 чэрвеня, Беларусь была прадстаўлена п'есай Андрэя Курэйчыка «Дзіцячы садок».

Як паведаміла прэс-служба Курэйчыка, яго камедыя пра парадоксы дзіцячага ўспрымання свету была прэзентавана на сцэне Нацыянальнага тэатра ў Вісбадэне. У нямецкім перакладзе Томаса Вайлера камедыю выканалі акцёры Нацыянальнага тэатра. П'еса атрымала высокую ацэнку фестывальнай крытыкі, а адно з нямецкіх выдавецтваў прапанавала яе апублікаваць.

Беларускі драматург таксама выступіў у ролі вядучага міжнароднага дзіцячага тэатральнага форуму «Еўропа — дзецям». Ён распавёў вучням малодшых класаў нямецкіх школ пра беларускую культуру, гісторыю і традыцыі. Курэйчык, зазначае прэс-служба, імкнуўся стварыць непрадузятае меркаванне пра Беларусь, у дачыненні да якой у Еўропе існуе нямала ілюзій і памылак. «Напрыклад, мясцовым дзецям у школе дагэтуль расказваюць, што Беларусь — гэта былая «Заходняя Расія». Думаю, нашай краіне яшчэ шмат трэба будзе зрабіць, каб на Захадзе пра нас даведаліся праўду», — цытуе драматурга прэс-служба.

Біенале еўрапейскага тэатра — найбуйнейшы ў свеце фестываль сучаснай драматургіі, які праходзіць раз на два гады. У розныя гады ён адкрыў для еўрапейскай публікі такія імёны, як Эймунтас Някрошус, Ясміна Рэза, Алвіс Херманіс, Васіль Сігараў, Іван Вырыпаеў, Кірыл Сярэбранікаў, Пётр Мамонаў і іншыя.

З НАГОДЫ

# Майкл Скэнлан: АСНОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

◂ **Працяг. Пачатак на стар. 1.**

У маі 2010-га мы казалі, што гэта статус-кво захавалася і што мы назіралі негатыўную тэндэнцыю ў сферы правоў чалавека, якая выклікае нашу занепакоенасць і якую нам трэба будзе ўлічваць, калі яна будзе працягвацца, пры разглядзе пытання пра санкцыі ў лістападзе гэтага года. Апошнім часам мы занепакоеныя і такімі падзеямі, як ціск на прафесара Манаева, звальнення якога з БДУ патрабуюць улады, і ціск на актывістаў кампаніі «Гавары праўду!».

Разам з тым мы застаёмся адкрытымі да дыялогу, да пашырэння магчымага супрацоўніцтва, але з беларускага боку павінна быць здзейснена нешта рэальнае, павінны быць рэальныя справы, а не толькі размовы пра тое, што трэба нешта рабіць. Мы заўсёды гатовыя да перамоваў, але нашы дзеянні будуць вызначацца дзеяннямі беларускага ўрада.

***— Зараз назіраюцца спробы перазагрузкі адносін паміж ЗША і Расіяй. Беларускіх дэмакратаў заўсёды хвалявала пытанне збліжэння пазіцый гэтых краін адносна дэмакратычных перамен у Беларусі. Якая верагоднасць такога збліжэння на сённяшні дзень?***

— Палітыка ЗША ў адносінах да Беларусі з'яўляецца палітыкай ЗША толькі ў адносінах да Беларусі. Яна можа тычыцца як двухбаковых пытанняў (такіх, як сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі), так і пытанняў, што выклікаюць глабальную занепакоенасць. Я часта вымушаны нагадваць маім беларускім калегам, што нашы рашэнні — гэта не рашэнні, якія прымаюцца з улікам адносін Усходу і Захаду па ўзорах часоў «халоднай вайны». Нашы адносіны — гэта адносіны з Беларуссю, якія грунтуюцца на трох прынцыпах, што я ўзгадваў вышэй. Спадзяюся, што гэта разумеюць і ва ўрадзе, і ў грамадстве, і ў апазіцыі. У нас няма ніякага жадання кагосьці ўвесці ў зман. Мы будуем свае адносіны з Беларуссю на ясных і празрыстых прынцыпах. Яны бачныя і зразумелыя, як знакі на дарозе.

***— Але на палітычных скрыжаваннях сучаснасці здараюцца моманты, калі інтарэсы сутыкаюцца. Прыклад — падзеі ў Кыргызстане, дзе ёсць амерыканская база. Між тым, былы прэзідэнт гэтай краіны атрымаў прытулак у Беларусі. Як гэта ўспрымаецца амерыканскім бокам?***

— Знаходжанне Бакіева ў Беларусі — гэта рашэнне беларускіх уладаў, якое яны прынялі, і займацца гэтым пытаннем ім. Важна зараз, каб высілкі часовага ўрада ў Кыргызстане па нармалізацыі і стабілізацыі сітуацыі далі свой плён, каб у краіне адбыліся свабодныя і празрыстыя выбары. Але Кыргызстан — не тое мейсца, дзе я зараз працую. Мае паўнамоцтвы заключаюцца ў тым, каб гаварыць аб адносінах Злучаных Штатаў з Беларуссю. Што тычыцца адносін паміж Злучанымі Штатамі і Расіяй, то абедзве краіны прымаюць рашэнні, зыходзячы са сваіх інтарэсаў.

***— У чым Злучаныя Штаты бачаць значэнне Беларусі ў агульнаеўрапейскім кантэксце?***

— На гэта пытанне поўны адказ павінна даць сама Беларусь. Як нядаўна сказаў беларускі міністр замежных спраў спадар Мартынаў, Беларусь не жадае быць часткай Расіі, не жадае быць часткай Еўрасаюза, Беларусь хоча быць часткай Еўропы. Цяпер засталося дачакацца, каб Беларусь вызначылася з тым, што гэта азначае. Еўрасаюз выказаў свой пункт погляду, свае пажаданні наконт таго, што Беларусь мусіць здзейсніць, калі яна імкнецца пашырыць рамкі свайго супрацоўніцтва з ЕС.



## Даведка

Майкл Скэнлан прыехаў у Беларусь 30 чэрвеня 2009 года ў якасці Часовага паверанага ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі.

Сп. Скэнлан распачаў дыпламатычную працу ў 1991 годзе ў амбасадзе ЗША ў Лондане. У 1992 годзе ён удзельнічаў у падрыхтоўцы да адкрыцця амерыканскай амбасады ў Алматы. З 1993 па 1995 год узначальваў палітыка-эканамічны аддзел амбасады ЗША ў Бішкеку, а з 1995 па 1996 год займаў такую ж пасаду ў Ерэване. З 1996 па 1998 год Майкл Скэнлан быў прыкамандзіраваны да Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, дзе працаваў на пасадзе спецыяльнага дарадцы Кіраўніка па цывільных зносінах пераходнай адміністрацыі ААН ва Усходняй Славоніі (UNTAES), Харватыя. З 1998 па 2000 год быў кіраўніком палітычна-эканамічнага аддзела консульства ЗША ва Уладзівастоку, дзе на працягу трох месяцаў выконваў таксама абавязкі галоўнага консула. У гэты ж перыяд сп. Скэнлан быў накіраваны на шэсць месяцаў у Падгорыцу (Чарнагорыя) для адкрыцця прадстаўніцтва ЗША. Пазней з 2000 па 2002 год узначальваў аддзяленне амбасады ЗША ў Баня-Луке (Боснія і Герцагавіна), а з 2002 па 2004 год займаў у Дзяржэпартаменце ЗША пасаду спецыяльнага дарадцы па пытаннях Украіны, Малдовы і Беларусі ў офісе каардынатара амерыканскай дапамогі краінам Еўропы і Еўразіі. Апошнім прызначэннем перад прыездам у Беларусь была пасада Кіраўніка аддзела тэхнічнай дапамогі органам правааховы і правасуддзя ў амбасадзе ЗША ў Кіеве, якую ён займаў з 2004 па 20008 год.

У 1984 годзе Майкл Скэнлан атрымаў ступень бакалаўра ў школе замежных спраў Джорджтаўнскага універсітэта, а ў 1989 годзе — ступень магістра міжнародных зносін у школе права і дыпламатыі універсітэта Тафтс.

Майкл Скэнлан атрымаў шэраг ганаровых узнагарод Дзярждэпартамента ЗША. Валодае баснійскай, сербскай і рускай мовамі. Вывучае беларускую.

***— У чым на сённяшні дзень супадаюць і ў чым разыходзяцца пазіцыі ЗША і Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі?***

— Пытанне, якое задаюць пастаянна. Іншы раз думаю, можа, я нешта выпусціў з-пад увагі. Я не бачу гэтых адрозненняў, пра якія гаворыць. Злучаныя Штаты і Еўрапейскі саюз адначасова, па адных і тых жа прычынах, прынялі санкцыі. Адначасова ж, па адных і тых жа прычынах, зменшылі санкцыі. Яны аднолькава занепакоеныя сітуацыяй з правамі чалавека, адсутнасцю адкрытасці, празрыстасці і магчымасцяў людзей у Беларусі самім вызначаць сваю будучыню.

У залежнасці ад умоў і абставін, працэсы па фарміраванні палітыкі могуць адрозніваца. Галоўнае ж тое, што ў выніку, нягледзячы на працэсы, палітыка ў адносінах да Беларусі аднолькавая.

Такім чынам, я сапраўды не бачу ніякай розніцы паміж палітыкай, якую праводзіць Еўрапейскі саюз, і палітыкай, якую праводзяць Злучаныя Штаты ў дачыненні да Беларусі.

***— Праграма «Усходняе партнёрства» практычна забуксавала яшчэ на старце. Ці ёсць, на Ваш погляд, сэнс прыкладаць намаганні па яе актывізацыі ў выключна эканамічных межах? Ці ўсё ж трэба рабіць акцэнт, як Вы і адзначалі, на каштоўнасцях?***

— Наш пункт погляду (і памочнік дзяржаўнага сакратара Гордан казаў пра гэта не аднойчы), што праграма «Усходняе партнёрства» — гэта цудоўная ініцыятыва. Яна стварае магчымасці для шасці краін — удзельніц гэтай праграмы. Ад іх залежыць, як скарыстацца магчымасцямі. У праграме два кампаненты — шматбаковае супрацоўніцтва і двухбаковае. У Беларусі было мала прагрэсу ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва, што ёсць вынікам беларускага выбару.

Еўрапейскі саюз — аб'яднанне краін на грунце агульных каштоўнасцей, якія падзяляюцца і больш шырокай еўраатлантычнай супольнасцю. «Усходняе партнёрства» — гэта той механізм, які быў прапанаваны як механізм далучэння да супрацоўніцтва на базе гэтых агульных каштоўнасцей. Ці скарыстацца ж гэтымі магчымасцямі — гэта ўжо залежыць ад той ці іншай краіны. Усе чакаюць эфекту праз паўгода-год, хаця, зразумела, гэты працэс патрабуе значна большага часу. Але мы ўбачым накірунак, які абралі краіны. На гэтым этапе, як мы бачым, Беларусь выказвае найменшы інтарэс да ўключэння ў гэтыя працэсы.

***— У свой час ЗША адыгралі адну з асноўных роляў у вызваленні палітычных зняволеных у Беларусі. Нядаўна завяршыўся працэс над Мікалаем Аўтуховічам. Ён асуджаны на пяць гадоў, хаця па сутнасці ўсе абвінавачванні сурпаць яго рассыпаліся. Беларускія праваабаронцы ацэньваюць гэты працэс як палітычна матываваны. Ваша пазіцыя на гэты конт?***

— Супрацоўнікі амбасады прысутнічалі на пасяджэннях суда. Мы ўважліва назіралі за працэсам і, як адзначылі ў сваёй заяве, занепакоеныя прысудам, вынесеным Мікалаю Аўтуховічу і яго калегам. У гэтым і іншых выпадках мы падкрэслівалі беларускім уладам важнасць прытрымлівацца належных юрыдычных працэдур. І спадзяваліся, што беларускія ўлады скарыстаюцца гэтай магчымасцю, каб прадэманстраваць сваю прыхільнасць да выканання юрыдычных працэдур і судовую незалежнасць. На жаль, ёсць прычыны ўсумніцца ў адпаведнасці гэтага працэсу ў тым, што тычыцца грамадзянскіх правоў спадара Аўтуховіча і трох другіх чалавек.

Калі ў Беларусі не будзе прадэманстравана большай павагі да базавых правоў чалавека, нам будзе складана ўбачыць магчымасці паляпшэння нашых адносін.

***— У гэтай сувязі, якая Ваша ацэнка сітуацыі са свабодай СМІ ў Беларусі ўключна з апошнімі захадамі па кантролю за інтэрнэтам?***

— На жаль, мы наглядаем узрастаючы ціск на сродкі масавай інфармацыі, што ёсць праяўленнем агульных негатыўных тэндэнцый у сферы правоў чалавека. Гэта папярэджанні газетам, ціск на журналістаў, пастаянная дазіроўка доступу ў дзяржаўную сістэму распаўсюду. Гэта і прыняцце артыкула 193–1, і артыкулаў, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасць за правы людзей на свабоду сходаў і выказвання свайго меркавання. Гэта і нежаданне беларускіх уладаў прыслухацца да рэкамендацый БДІПЧ, каб забяспечыць неабходныя ўмовы для правядзення свабодных і празрыстых выбараў. Гэта і патэнцыйная пагроза абмежавання доступу да інтэрнэта. Паглядзім, як сітуацыя з інтэрнэтам будзе выглядаць пасля 1 ліпеня.

Як мы ўжо адзначалі, усе гэтыя акалічнасці будуць браца пад увагу, калі мы будзем прымаць рашэнне па санкцыях у лістападзе бягучага года.

***— У Беларусі набліжаецца прэзідэнцкая выбарчая кампанія. Ці будзе гэта кампанія ў полі зроку амбасады ЗША? У якіх рамках, па якіх крытэрыях будзе ацэньвацца легітымнасць будучых выбараў прэзідэнта?***

— Ключавы момант — працэс, правядзенне выбараў. Не толькі на дзень галасавання, але ўсёй кампаніі. Паўтаруся, у ЗША няма фаварытаў, няма любімчыкаў. Мы звяртаем увагу на працэс і сістэму. У гэтым ёсць інтарэс любога абранага чыноўніка — мець легітымны мандат, адвочны як для людзей, якія яго абралі, так і для краін-партнёраў, з якімі ён будзе супрацоўнічаць. І таму мы будзем глядзець, ці сапраўды з'явіцца ў людзей Беларусі магчымасць свабодна абіраць і ці будуць выбары сапраўды празрыстымі і адкрытымі.

На жаль, зыходзячы з таго, як былі праведзены мясцовыя выбары, сітуацыя не ўнушае адпаведнай упэўненасці. Мы адкрыта віталі крок Беларусі ўвесну 2009 года да супрацоўніцтва з БДІПЧ, з партыямі і грамадскімі арганізацыямі па пытаннях удасканальвання выбарчага заканадаўства ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. На жаль,

**Наша палітыка вельмі простая: правы чалавека і санкцыі — узаемазвязаныя. Мы адкрытыя да супрацоўніцтва і пошуку сфер, якія цікавыя для абодвух бакоў**

# ЗАСТАЮЦЦА НЯЗМЕННЫМІ

гэта супрацоўніцтва спынілася гэтак жа нечакана, як і пачалося. Мы спадзяемся, што беларускі ўрад адновіць супрацоўніцтва, каб забяспечыць выбарчаму працэсу адкрыты і празрысты характар. І хто б у такіх умовах ні быў абраны — гэта выбар людзей, і ў Злучаных Штатаў не будзе ніякіх пытанняў.

Наша палітыка вельмі простая: правы чалавека і санкцыі — узаемазвязаныя. Мы адкрытыя да супрацоўніцтва і пошуку сфер, якія цікавыя для абодвух бакоў. Калі ёсць нешта такое, у чым ЗША могуць дапамагчы беларусам, у Злучаных Штатаў няма прычын, каб гэтага не рабіць.

***— Ёсць працэс, але ёсць і імітацыя працэсу. Як тут быць?***

— Мы адкрытыя для дыялога, але павінен быць дыялог, скіраваны на дзеянні, а не на размовы. І, на маё меркаванне, стаўленне Еўрапейскага саюза да гэтага не адрозніваецца ад нашага падыходу.

***— Афіцыйныя беларускія СМІ часта папракаюць ЗША і Еўрасаюз у выдзяленні грантаў для беларускай апазіцыі. А ці выдзяляюцца гранты беларускім дзяржаўным установам, у тым ліку праз амбасаду?***

— Мы не аказваем падтрымкі дзяржаўным установам, за нязначнымі выключэннямі, калі гэта тычыцца, напрыклад, рэстаўрацыі помнікаў культуры. Але гатовыя аказваць падтрымку ў тых сферах, дзе наша дапамога відавочна і адназначна пойдзе на карысць беларускага народа. Напрыклад, у вяртанні дзяцей-сірот у біялагічныя ці прыёмныя сем'і. Яшчэ адна сфера — дапамога людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца намі ў супрацоўніцтве з грамадзянскай супольнасцю, а ўжо недзяржаўныя арганізацыі могуць іншы раз працаваць у партнёрстве з дзяржаўнымі структурамі. Тое ж можна сказаць пра супрацоўніцтва па супрацьдзеянню гандлю людзьмі. Напрыклад, мы падтрымалі недзяржаўную арганізацыю ў Брэсце, якая стварыла гарачую лінію дапамогі ахвярам гандляроў людзьмі.

Мы аказваем падтрымку у арганізацыі кансультацый для прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. Падтрымліваем пэўныя ініцыятывы ў сферы адукацыі. Мы імкнёмся дапамагчы Беларусі ўсталяваць праграму MBA — ступені магістра ў сферы кіравання бізнесам, якая б цалкам адпавядала сістэме кваліфікацыі, прынятай у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

Усё гэта мае важнае значэнне, бо адкрывае людзям магчымасці быць удзельнікамі, творцамі працэсаў, якія не ёсць толькі вынікам рашэнняў, што прымаюцца ўладамі.

Урад ЗША вельмі цэніць грамадскае партнёрства, якое дапамагае знаходзіць аптымальныя варыянты рашэння самых розных праблем. Гэта называецца адкрываць прастору для новых ідэй і, такім чынам, для новых магчымасцей. Гэта працэс, які ўцягвае, а не выключае, садзейнічае творчасці, а не абмяжоўвае яе.

***— А якое жыццё дыпламата Майкла Скэнлана па-за працай?***

— Я прытрымліваюся той формулы, што павінна быць прафесійнае жыццё і прыватнае. Баланс паміж імі — гэта ключ. І калі вам пашанцуе, то і праца, і прыватнае жыццё будуць прыносіць асалоду.

З НАГОДЫ

# РАЗУМЕННЕ КАНСТЫТУЦЫІ ПА-ЎКРАІНСКУ

Генадзь КЕСНЕР

**28 чэрвеня Украіна адзначыла ўжо чатырнаццаты Дзень Канстытуцыі. А напярэдадні ў амбасадзе нашай паўднёвай суседкі адбыўся «круглы стол» з удзелам непасрэдных сведак і ўдзельнікаў тых гістарычных гадзінаў — тагачасных народных дэпутатаў, якія спрычыніліся да лёсавызначальнай для ўкраінскай дзяржавы падзеі. Так атрымалася, што адным з аўтараў актуальнага Асноўнага закона Украіны з'яўляецца цяперашні амбасадар гэтай дзяржавы ў Беларусі Раман Бяссмертны, які запрасіў на сустрэчу яшчэ аднаго з аўтараў Канстытуцыі Украіны Віктара Мусіяку — тагачаснага дэпутата Рады.**




На пачатку імпрэзы прысутным, сярод якіх былі прадстаўнікі ўкраінскай дыяспары ў Беларусі, дыпламатычных місій іншых дзяржаваў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, сябры беларускіх грамадскіх аб'яднанняў і журналісты, прадэманстравалі дакументальныя здымкі раніцы 28 чэрвеня 1996 года, калі ў 9.20 дэпутаты большасцю галасоў, з немаведама якой спробы, усё ж прынялі Канстытуцыю Украіны.

Працэдура прыняцця Асноўнага закону доўжылася амаль суткі, таму на гістарычных кадрах добра відаць, як многія з дэпутатаў украінскага парламента не маглі стрымаць слёз, калі ўсё ж удалося набраць неабходныя для прыняцця Канстытуцыі 302 галасы народных абраннікаў.

«Ёсць рэчы, пра якія нельга ўзгадваць без слёз. Асабліва калі ўглядаешся ў гэтыя гістарычныя кадры. Вось дэпутат Міхаіл Сірата, які ачольваў нашу канстытуцыйную камісію, ён прастаяў на трыбуне васемнаццаць гадзін, дакладваючы тэкст Канстытуцыі. Яго, на жаль, сёння няма з намі, ён трагічна загінуў два гады таму. Але вы бачыце слёзы на яго вачах на гэтых кадрах пасля прыняцця Асноўнага закону, а я не магу стрымаць слёз, калі бачу гэту стужку», — кажа Віктар Мусіяка.

У чым была складанасць прыняцця Асноўнага закона? Прэзідэнцкая (Леаніда Кучмы) адміністрацыя рыхтавала свой праект Асноўнага закона. Гэты «прэзідэнцкі» праект, які прадугледжваў яшчэ больш неабмежаваныя магчымасці кіраўніка дзяржавы, меркавалася вынесці на рэферэндум. Урад, як распавёў Віктар Мусіяка, падпарадкоўваўся кіраўніку дзяржавы, і ў адзін з самых вырашальных момантаў была здзейснена спроба зрабіць усё, каб парламент не змог прыняць Канстытуцыю.

«Выступаў Міхаіл Сірата, калі паступіла каманда, каб усе ўрадаўцы, якія адначасова былі дэпутатамі парламента, у дзве гадзіны ночы паехалі на выязное пасяджэнне ўраду! У іншы горад. А кожны голас — на ўліку. Трэба было сама мала 300 галасоў, каб прыняць Канстытуцыю, а набралася 299… Яшчэ адзін момант, даволі трагічны. 178 галасоў — гэта былі прадстаўнікі «левых сілаў» — камуністы, сацыялісты ды сяляне. Без іх немагчыма прыняць Канстытуцыю», — распавядае Віктар Мусіяка.

Апроч таго, былі моманты, калі прысутныя на парламенцкай сесіі прадстаўнікі нацыяналістычных сілаў, таго ж Народнага Руху, па нейкіх сваіх разуменнях папросту не жадалі рэгістравацца.

Паводле словаў Віктара Мусіякі, даводзілася пераконваць кожнага з гэтых народных абраннікаў, тлумачыць, чаму менавіта зараз і менавіта парламентам трэба прыняць Асноўны закон.

Дэбаты вяліся па кожнай фармулёўцы, па кожнаму артыкулу Канстытуцыі. Але, чаго не чакалі нават аўтары, найбагацей часу заняло абмеркаванне прэамбулы. Як адзначыў Віктар Мусіяка, аўтарам праекту ўдалося адстаяць фармулёўку «ўкраінскі народ», а не «народ Украіны», што замацоўвала нацыянальнае азначэнне дзяржаўнага ўтварэння пад назвай «*Украïна*». «Мы ўжо менавіта тут закладвалі паняцце ўкраінскай нацыі, палітычнай нацыі, таму што «ўкраінскі народ» — гэта грамадзяне ўсіх нацыянальнасцей. І гэтым актам мы павінны былі аб'яднаць увесь народ, які пражывае на тэрыторыі Украіны… Дарэчы, аўтарам такой фармулёўкі быў прадстаўнік румынскай нацыянальнасці Іан Папэску», — адзначыў спадар Мусіяка.

Былі і іншыя моманты, напрыклад, менавіта частка «левых» вельмі негатыўна ставілася да прысутнасці ў прэамбуле Асноўнага закона слова «Бог», вялікія дыскусіі выклікалі вызначэнні формаў уласнасці і гэтак далей. Зашмат гадзін дыскусій, спрэчак, галасаванняў…

І вось апошняя спроба — у 9.20. Табло высвечвае — «за» — 302 галасы. Секундная цішыня. Потым грымнулі апладысменты, воклічы і… слёзы. Ад стомленасці і радасці. Ад адчування перамогі. Ад усведамлення таго, як потым казалі кіраўнікі парламента, што «Украіна адбылася як дзяржава». Дарэчы, прэзідэнт Леанід Кучма, які меў уласны сцэнар прыняцця Асноўнага закона, выглядаў крыху ашаломленым, але папрасіў прабачэння за тое, што «неналежным чынам стымуляваў прыняцце Канстытуцыі», і прызнаўся, што не верыў у здольнасць парламента прыняць гэты лёсавызначальны дакумент…

Прайшло чатырнаццаць гадоў, але спробы змяніць Асноўны закон на Украіне не спыняюцца. Вось і новы прэзідэнт Віктар Януковіч адназначна выступае за ўнясенне зменаў у Канстытуцыю, якія б далі яму больш улады. «Кожны прэзідэнт, які атрымлівае ўладу, мяркуе, што ў яго замала паўнамоцтваў. І гэта вельмі небяспечна, калі палітык спрабуе пад сябе змяніць Канстытуцыю, якая б яна недасканалая ні была, — адзначыў Віктар Мусіяка. — Усё ж спадзяюся, што да гэтага справа не дойдзе».

Украінец мае рацыю, калі выказвае занепакоенасць магчымымі зменамі ў Асноўны закон, ініцыяванымі канкрэтным кіраўніком дзяржавы. Беларускі досвед — добрае абгрунтаванне такой занепакоенасці.



Раман Бяссмертны



Віктар Мусіяка

ЖЫЦЦЁ

# НЯМА ЧЫМ ПЛАЦІЦЬ

Іван БАРЫСАЎ

**Больш за 200 чалавек у Шклоўскім раёне маюць запазычанасць па аплаце жыллёва-камунальных паслуг.**

Днямі шклоўская раённая газета «Ударны фронт» у двух нумарах апублікавала вялікі спіс кватэранаймальнікаў, якія маюць запазычанасць па аплаце жыллёва-камунальных паслуг і капітальнаму рамонту больш за два месяцы. Спіс уключае ў сябе 228 асоб, сума запазычанасці якіх вагаецца ад трохсот тысяч да пяці мільёнаў беларускіх рублёў.

Метадам агалошвання праз мясцовую прэсу прозвішчаў неплацельшчыкаў за паслугі ЖКГ шклоўскія камунальнікі карыстаюцца не ўпершыню, аналагічныя спісы публікаваліся ў раённай газеце і ў мінулым годзе. Па словах аднаго з супрацоўнікаў камунгаса, гэта дае пэўны станоўчы эфект, некаторыя з неплацельшчыкаў пачынаюць пагашаць запазычанасць, бо ім сорамна перад знаёмымі.

Для таго, каб даўжнікі нарэшце пачалі пагашаць запазычанасць, выкарыстоўваюцца і больш радыкальныя метады. У кожным з камунгасаў Магілёўскай вобласці ёсць спецыяльныя брыгады, якія прыпыняюць падачу вады, адключаюць ацяпленне і каналізацыю злосным неплацельшчыкам. Пры гэтым камунальнікі не звяртаюць асаблівай увагі на тое, што пасля адключэння вады і каналізацыі ў гэтых людзей іх ні ў чым не вінаватыя суседзі жывуць быццам бы ў «газавых камерах». А санітарныя нормы і правілы пражывання пакуль яшчэ ніхто не адмяняў.

«Праблем з неплацельшчыкамі сапраўды ўзнікае вельмі шмат, — кажа былы супрацоўнік шклоўскага камунгаса Аляксандр Н. — Не плацяць за камунальныя паслугі не толькі так званыя «асацыяльныя элементы», ці, прасцей кажучы, п'яніцы, якіх апроч гарэлкі нічога не цікавіць, а і цалкам прыстойныя людзі. Я асабіста ведаю выпадкі, калі чалавек страціў працу і не можа своечасова разлічыцца за кватэру, калі запазычанасць узнікла з-за таго, што сям'я вучыць дзяцей за плату ў вышэйшай навучальнай установе, і грошай няма літаральна на самае неабходнае. А колькі сярод неплацельшчыкаў адзінокіх пенсіянераў, у якіх пенсіі хапае толькі на лекі і танныя прадукты харчавання! Ды і наогул шмат людзей у Шклоўскім раёне маюць невялікія заробкі (асабліва ў вёсцы) і з цяжкасцю могуць аплаціць усе выдаткі».



Сярэдняя заработная плата ў Шклоўскім раёне за студзень-сакавік 2010 года склала 820,4 тысячы рублёў. Па ўзроўню заробкаў шклоўчане нашмат адстаюць ад жыхароў многіх іншых рэгіёнаў Беларусі. Для прыкладу, сярэднемесячная налічаная заработная плата па краіне ў студзені-сакавіку склала 1 мільён 38,3 тысячы рублёў.

## КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ПРАВЫ СПАЖЫЎЦА

**Да нас у газету ад грамадзян прыходзіць шмат лістоў, мы вырашылі аб'яднаць іх у рубрыку «Правы спажыўца». Адказы на пытанні чытачоў падрыхтаваў праваабаронца ПЦ «Прававая дапамога насельніцтву» (Кіеў, Украіна) з Мастоў Зміцер Кухлей.**



- *Два месяцы таму ў краме набыў тэлевізар «Гарызонт». Прайшло 4 тыдні, і тэлевізар зламаўся. Знаходзіцца ў рамонце больш за месяц, і калі будзе гатовы, не вядома. Што рабіць?*

Гарантыйны рамонт павінен быць зроблены на працягу 14 дзён з моманту звароту спажыўца ў сервісны цэнтр. У гэтай сітуацыі спажывец мае права адмовіцца ад далейшага правядзення рамонту, таму што ліквідацыя недахопу патрабуе вялікіх выдаткаў часу, і патрабаваць у прадаўца вярнуць грошы за няякасны тавар.

- *Набыў білет на аўтобус, які ідзе па маршруту «Мінск—Масты». У дарозе аўтобус зламаўся. Давялося дабірацца папутным транспартам, таму што на працягу 30 хвілін іншы аўтобус так і не падалі. Якія прэтэнзіі можна прад'явіць аўтавакзалу?*

Пасажыры маюць права патрабаваць кампенсацыі кошту квітка і кампенсацыі маральнай шкоды.

- *У пакупніка была прэтэнзія да мяккай мэблі, мэблю замянілі на новую з пратэрміноўкай у тры месяцы. Пакупнік пасля замены мэблі напісаў распіску: матэрыяльных і маральных прэтэнзій не маю. Зараз пакупнік пагражае судом, патрабуе добраахвотна задаволіць яго прэтэнзіі па выплаце няўстойкі за несвоечасовае закрыццё прэтэнзіі і маральную шкоду. На што ў гэтым выпадку мае права пакупнік?*

Калі дамовай была прадугледжана няўстойка, тады ён можа звярнуцца ў суд, у выпадку парушэння тэрмінаў ліквідацыі недахопаў. Суд будзе ацэньваць у сукупнасці ўсе доказы, у тым ліку і распіску.

- *Здаваў у рамонт DVD плэер, таму што не чыталіся дыскі. Вельмі доўга ўсё рабілі, давялося ездзіць два разы і прыспешваць. Праз пару тыдняў пасля таго, як забраў плэер з рамонту, праблема зноў паўтарылася, і зараз плэер не працуе. Рамонт рабіўся па гарантыі ў сервісным цэнтры. Што вы можаце параіць у гэтай сітуацыі?*

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», асобе, якой прадалі тавар неналежнай якасці, калі яго недахопы не былі абгавораны прадаўцом, прадастаўляецца магчымасці на свой выбар патрабаваць:

1.1. замены няякаснага тавару таварам належнай якасці;

1.2. суразмернага змяншэння пакупніцкай цаны тавару;

1.3. неадкладнай бескаштоўнай ліквідацыі недахопаў тавару;

1.4. кампенсацыі выдаткаў па ліквідацыі недахопаў тавару.

У выпадку выяўлення недахопаў тавару, якасці якога не дазваляюць ліквідаваць гэтыя недахопы (харчовыя прадукты, тавары бытавой хіміі і інш.), спажывец мае права па свайму выбару запатрабаваць замены такога тавару таварам належнай якасці або суразмернага змяншэння пакупной цаны.

- *Збіраюся набыць у краме дарагі свяцільнік. Ці магу я (калі так, то ў які тэрмін) вярнуць пакупку і атрымаць грошы ці абмяняць, калі не падыдзе колер або мадэль?*

Можаце вярнуць на працягу 14 дзён. Патрабаванне спажыўца аб абмене або вяртанні тавару павінна быць выканана, калі тавар не быў у спажыванні, захаваны яго спажывецкія якасці і маюцца доказы набыцця яго ў гэтага прадаўца. Адзінае, калі на свяцільнік будзе гарантыя, напрасіце не ставіць адзнаку крамы аб продажы ў пашпарце (або дакуменце, які яго замяняе), таму што ў гэтым выпадку свяцільнік не можа быць вернуты.

- *Два тыдні таму набыў скураную куртку. Куртка афарбоўвае рэчы, якія апрануты пад ёй. Якія патрабаванні можна прад'явіць і каму, прадаўцу ці вытворцу?*

Няўстойлівасць фарбавальніка з'яўляецца хібай вытворчага характару. Спажывец мае права па свайму жаданню прад'явіць патрабаванні прадаўцу або вытворцу аб скасаванні дамовы куплі-продажу і пакрыцці страт, якія былі прынесены яму няякасным таварам.

- *Набыў набор рондаляў з тэфлонавым пакрыццём. Гарантыйны тэрмін — 6 месяцаў. Пасля эксплуатацыі на працягу 2 месяцаў усе рондалі сталі непрыдатнымі да ўжывання. Прадавец адмовіўся задаволіць маё патрабаванне аб замене. Што рабіць?*

Спажыўцу неабходна звярнуцца з пісьмовай заявай на імя прадаўца з указаннем недахопаў у тавары і канкрэтнага патрабавання. На працягу 14 дзён з моманту атрымання заявы прадавец абавязаны зрабіць за свой кошт незалежную экспертызу. Па выніках праведзенай экспертызы або задаволіць патрабаванні спажыўца або адмовіць у задавальненні яго патрабаванняў. Спажывец мае права прысутнічаць пры правядзенні экспертызы, пра месца і час якой прадавец павінен паведаміць спажыўцу.

- *Боты аддалі ў майстэрню для таго, каб паставілі новыя набіванкі. У выніку рамонту пашкодзілі абцас. Што рабіць?*

Спажывец мае права заявіць патрабаванне аб замене абцаса. У выпадку немагчымасці ліквідаваць недахоп — патрабаваць прадастаўлення аналагічнай мадэлі абутку або пакрыцця кошту абутку.

- *У снежні 2008 года набыў электрасушылку для абутку. 13 мая 2009 года па гарантыі бясплатна адрамантавалі. У лютым гэтага года яна зноў зламалася. На сушылку гарантыя 1 год, тэрмін эксплуатацыі 5 год. Скажыце, калі ласка, ці магу я зараз вярнуць два разы зламаную сушылку назад у крамы або абмяняць яе на такую ж або забраць грошы? Чэк і дакументы ёсць.*

У выпадку бескаштоўнай ліквідацыі недахопаў тавару гарантыйны тэрмін на яго працягваецца на перыяд, на працягу якога тавар не выкарыстоўваўся, то бок на той перыяд часу, калі сушылка знаходзілася ў рамонце з даты звароту ў майстэрню да даты вяртання адрамантаванай сушылкі. Калі з улікам гэтага тэрміну гарантыйны тэрмін не скончыўся, вы маеце права звяртацца ў краму з патрабаваннем аб замене тавару або вяртанні грошай. А патрабаваць у прадаўца адрамантаваць тавар вы можаце на працягу двух гадоў з моманту набыцця сушылкі паводле ч. 3 арт. 14 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», дзе зазначана, што прадавец забяспечвае магчымасць тэхнічнага абслугоўвання і рамонту тавару на працягу гарантыйнага тэрміну, а калі гарантыйны тэрмін не ўстаноўлены або складае меней за два гады, — на працягу двух гадоў з дня рэалізацыі спажыўцу тавару, калі больш працяглыя тэрміны не ўстаноўлены заканадаўствам і (або) дамовай. Гэта значыць, што вы маеце права на працягу двух гадоў звярнуцца да прадаўца, а той, у сваю чаргу, арганізаваць вам рамонт тавару, у тым ліку і скіраваць вас у адпаведную рамонтную майстэрню. Пры гэтым рамонт павінен быць зроблены бясплатна.

- *Ці з'яўляецца правамоцным, што прадавец прадстаўляе гарантыйны тэрмін на халадзільнік на 1 год, калі ў пашпарце вытворцы пазначаны гарантыйны тэрмін 2 гады?*

Паводле артыкула 13 пункта 5 Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў», прадавец абавязаны вызначыць на тавар гарантыйны тэрмін, калі вытворца (пастаўшчык) не выканаў прадугледжаны заканадаўствам абавязак па яго вызначэнні або выканаў яго неналежным чынам. Прадавец мае права вызначаць на тавар дадатковы гарантыйны тэрмін, большы за гарантыйны тэрмін, які прадугледжаны заканадаўствам і (або) вызначанага вытворцам (пастаўшчыком), а таксама гарантыйны тэрмін на тавар, на які гарантыйны тэрмін вытворцам (пастаўшчыком) не вызначаны і абавязак па вызначэнню якога не прадугледжаны заканадаўствам. Прадавец не мае права вызначаць або аб'яўляць гарантыйны тэрмін на тавар меней за гарантыйны тэрмін, які вызначаны вытворцам (пастаўшчыком).



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ TV

## 5 ліпеня, панядзелак

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.10** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Меладрама «Крылы анёла» (Украіна).
**14.05** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія-Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Сем жонак аднаго халасцяка».
**16.30** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 01.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Відэафільм АТН «Блізкія да народу».
**20.00** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Пастка» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Ціхая буржуазія».
**22.00** «Александрыя збірае сяброў». Канцэрт.
**00.15** Серыял «Часткі цела-5 « (ЗША).
**01.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 01.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Гарады-героі. Мінск».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Мінск». Працяг.
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Злачынствы стагоддзя».
**00.05** «Мотафрыстайл. Чэмпіянат свету».
**01.20** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** СТБ прадстаўляе: «Пяты фронт». Дакументальны фільм. Заключная серыя.
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Прыцягненне». Украіна, 2009 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Чаклун і Румба». Беларусь, 2007 г.

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Унівэр» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Прыгодніцкая музычная камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (СССР).
**12.10** «Пра мастацтва».
**12.40** Школа рамонту.
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Тэлебарометр.
**15.05** Медычныя таямніцы.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Камедыйны серыял «Унівэр» (Расія).
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.45** Драматычны трылер «Жыццё ў пазыку» (Расія).
**00.20** Запал і ўлада.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Чортава кола Арно Бабаджаняна». Дакументальны фільм.
**12.20** Фільм «Шлях дадому». 2008 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Фільм «Улетку я аддаю перавагу вяселлю». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.35** «Абарона опера». Дак. фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.20** «Прафесія-рэпарцёр».
**10.45** «Кулінарны паядынак».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**12.35** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.10** «Выратавальнікі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Рускі дубль».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Сумленны панядзелак».

### EUROSPORT

**09.30, 12.00, 13.45, 23.30, 02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Матаспорт на выхадных.
**10.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Порціман, Партугалія.
**11.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 1-ы этап.
**11.55, 00.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.30** Веславанне. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Іспанія. Дзень 2-і.
**14.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**15.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тамэсівары (разбіванне прадметаў). Чэмпіянат свету. Часопіс.
**19.00** «Гэтыя неверагодныя сабакі!» Арланда. Часопіс.
**20.00** Веласпорт. "Тур дэ Франс". 2-і этап.
**21.00, 21.40** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**01.00** Веславанне. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Іспанія. Дзень 2-і.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40, 20.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.05** Басаног па свеце.
**08.30** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.45** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**09.40** Вагон.
**09.50** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял.
**10.35** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**11.20** Фільматэка майстроў: «Слёзы Шахеразады», дак. фільм, 2006 г., Ізраіль.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял.
**18.15** Аўтастопам праз Еўропу: 5 серыя, «Парыж».
**18.35** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**18.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.30** Блізкая гісторыя. Іншы пагляд: «52 адсоткі», дак. фільм, 2007 г., Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя.
**21.40** Фільматэка майстроў: «Слёзы Шахеразады», дак. фільм, 2006 г., Ізраіль.
**23.05** Аб'ектыў.

## 6 ліпеня, аўторак

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.40, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Ціхая буржуазія».
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Пастка».
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Цудаў не бывае».
**14.10** Дак. цыкл «Вялікая вайна».
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Сем жонак аднаго халасцяка».
**16.30** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**17.30** Сфера інтэрасаў.
**17.50, 00.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Пастка».
**20.30** Панарама.
**20.55** Відэафільм АТН «Першая пяцёрка».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**00.10** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Прыцягненне». Украіна, 2009 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

### лад

**07.30** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.00** Кінааповесць «Іван».
**09.10** Дак. фільм «Лі Харві Освальд і КДБ».
**10.00** Нашы тэсты.
**10.35** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**12.05** «Запал па культуры».
**12.45** Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Віват, гардэмарыны!» (СССР).
**15.20** Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны-3» (СССР).
**17.30** Авантурная камедыя «Мова святога».
**19.35** «Летні жарт з...» Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.40** Ваенная любоўная драма «Франц + Паліна» (Расія).
**23.00** Жаночая ліга.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Жывы гук.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Пакой смеху».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.40** Тэлесерыял «Каменская».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.55** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Па той бок жыцця і смерці. Пекла». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «І зноў добры дзень!».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Прафесія-рэпарцёр».
**10.45** «Кватэрнае пытанне».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**12.35** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Рускі дубль».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Галоўны герой прадстаўляе»: «Анатоль Кашпіроўскі. Вяртанне доктара».

### EUROSPORT

**09.30, 11.15, 13.30, 02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 2-і этап.
**11.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**11.45** Веславанне. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Іспанія. Дзень 2-і.
**12.30** «Гэтыя неверагодныя сабакі!» Арланда. Часопіс.
**14.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 2-і этап.
**15.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 3-і этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тамэсівары (разбіванне прадметаў). Чэмпіянат свету. Часопіс.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** «Камень, нажніцы, папера». Нацыянальны чэмпіянат у ЗША.
**20.00** Навіны.
**20.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**20.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 3-і этап.
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO у Германіі.
**22.00** Бокс.
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**00.40** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**01.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно ў Венгрыі (Будапешт). Агляд.
**01.45** Матаспорт на выхадных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Прыватная калекцыя.
**08.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.25** Аўтастопам праз Еўропу: 5 серыя, «Парыж».
**08.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**09.10** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы пагляд: «52 адсоткі», дак. фільм, Польшча–Расія.
**09.50** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.15** «Мент», дэтэктыўны серыял.
**11.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**11.20** «Вулічныя гульні», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША. 1 серыя.
**19.05** Госць «Белсату»: Тамара Лісіцкая.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Апошні сезон», серыял.
**22.15** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 7 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Пастка». 2-я серыя.
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Іўеўскі малітваслоў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Першая спроба» (Расія).
**14.05** «Альманах вандраванняў».
**14.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі» (Беларусь).
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камедыйны серыял «Сем жонак аднаго халасцяка» (Расія). Закл. серыя.
**16.30** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**17.30** «Зямельнае пытанне».
**17.55, 00.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Серыял «Пастка». 3-я серыя.
**20.30** Панарама.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30, 01.40** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**23.35** «Фрунзік Мкртчан. Чалавек з ганарлівым профілем».
**00.35** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мінчшына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Дабро пажаліцца».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**11.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.10** Спорт-кадр.
**12.40** Дакументальны фільм «Гісторыя жартуе» (Канада-ЗША).
**13.05** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.05** Дакументальны фільм «Застылая музыка Лангбарда» (БТ).
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**17.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**19.05** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.55** Жаночая ліга.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Запал і ўлада.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Ва ўсім прашу вінаваціць Бітлз». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Тэлесерыял «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карmеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**22.15** Тэлесерыял «Дворык».
**22.50** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Няма дыму без агню. Таямніца пажару на Васільеўскім». Дак. фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх нíравы».
**10.20** «Прафесія-рэпарцёр».
**10.45** «Дачны адказ».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**12.35** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Рускі дубль».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Позняя гутарка».

### EUROSPORT

**09.30, 12.00, 02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 3-і этап.
**11.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**11.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**12.30** «Камень, нажніцы, папера». Нацыянальны чэмпіянат у ЗША.
**13.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 3-і этап.
**14.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 4-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тамэсівары (разбіванне прадметаў). Чэмпіянат свету. Часопіс.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**19.50** Абранае па серадах.
**20.00** Навіны коннага спорту.
**20.05** Гольф. Тур PGA. Турнір AT&T National (Бетэзда, ЗША).
**21.05** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Францыі (Гіянкур).
**21.35** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Тэнэрыфэ (Санта-Крус).
**21.45** Гольф-клуб.
**21.50** Ветразевы спорт. Рэгата La Giraglia Rolex Cup (Генуя, Італія).
**22.20** Ветразевы спорт. MedCup (Францыя).
**22.50** Яхт-клуб.
**22.55** Абранае па серадах.
**23.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**01.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.15** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**01.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату»: Тамара Лісіцкая.
**08.05** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**09.00** «Апошні сезон», серыял.
**09.55** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.20** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**10.45** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША. 1 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Апошні сезон», серыял.
**18.25** Невядомая Беларусь: «Гаспадар...», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**18.55** Хто ёсць кім?: «Драма Васіля Старавойтава», ч. 2.
**19.10** Паляванне на дзівосы.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.05** Прыватная калекцыя.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Побач з намі (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Пад абцасам», моладзевая камедыя, 2005 г., ЗША.
**22.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**22.55** Аб'ектыў.

## 8 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Пастка» (Расія-Украіна). 3-я серыя.
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Першая спроба» (Расія). 2-я серыя.
**13.50** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Уласнай персонай».
**15.55** Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 01.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Пастка» (Расія-Украіна). 4-я серыя, заключная.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.05** Дэтэктыўны трылер «Памежны горад» (ЗША).
**00.10** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**01.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Выклік-3». Шматсер. фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Андрэй Краско. Непадобны да артыста».
**00.35** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мінчшына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**11.25** Экспедыцыя.
**11.55** Жывы гук.
**12.40** Жаночая ліга.
**13.10** Дакументальны фільм «Гісторыя жартуе» (Канада-ЗША).
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** Мультфільм.
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.45** Трылер «Выхад на пасадку» (Францыя-Люксембург).
**00.30** Запал і ўлада.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Кулебякай па дыктатары. Гастранамічная настальгія». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Тэлесерыял «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карmеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** Прэм'ера. «Злата Прага і яе рускі бляск». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Бульдог-шоў».
**09.25** «Жаночы погляд».
**10.20** «Прафесія-рэпарцёр».
**10.50** «Вочная стаўка».
**11.40** Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**12.30** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Рускі дубль».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Позняя гутарка».

### EUROSPORT

**09.30, 12.00, 13.30, 23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Навіны.
**10.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно ў Венгрыі (Будапешт). Агляд.
**10.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**11.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.30** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**14.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно ў Венгрыі (Будапешт). Агляд.
**15.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 5-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тамэсівары (разбіванне прадметаў). Чэмпіянат свету. Часопіс.
**19.00** «Гэтыя неверагодныя сабакі!» Фінал. Часопіс.
**20.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 5-ы этап.
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.40** Навіны.
**21.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб (Польшча).
**00.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**00.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.00** Пра рэстлінг - Vintage Collection. ЗША.
**02.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** На колах.
**07.50** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**08.15** Прыватная калекцыя.
**08.35** Паляванне на дзівосы.
**08.50** Невядомая Беларусь: «Гаспадар...», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**09.20** Хто ёсць кім?: «Драма Васіля Старавойтава», ч. 2.
**09.40** «Апошні сезон», серыял.
**10.30** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.55** «Пад абцасам», моладзевая камедыя, 2005 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «На мяжы нормы», маст. фільм, ЗША.
**19.05** YoLife! (моладзевая праграма).
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.00** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**22.15** «Сістэма», дак. фільм, 2008 г., Германія–Італія–Канада–Эстонія.
**23.20** Аб'ектыў.

## 11 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**Першы канал (1)**

**08.10** Мультфільм.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**10.00** Альманах вандраванняў.
**10.25** Прэм'ера. Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Дзённік.
**12.15** Меладрама «Душачка» (СССР).
**13.45** «Залатыя Віцязі» Беларусі». Перадача 1-я.
**14.15** «OFF STAGE LIFE».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Дзённік.
**15.35** Відэафільм АТН «Модныя грошы».
**15.55** «Славянскі базар у Віцебску-2010».
**17.55** Суперлато.
**18.50** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Дзённік.
**18.55** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.50** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.05** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Дзённік.
**21.20** Футбол. Чэмпіянат свету. Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.40** Крымінальная драма «Калібр 45» (ЗША).

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** «Фазэнда».
**12.35** Анімацыйны фільм «Пітэр Пэн у Нетландзіі».
**13.45** Прэм'ера. «Эмануіл Вітарган. Сустрэча з гледачамі».
**15.05** Севастопальскія апавяданні.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**18.10** Канцэрт Р.Паулса «Лепшыя песні».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** Прэм'ера. «Песні для Алы».
**00.10** Фільм «Скура саламандры».

**СТВ**

**07.20** «Афрамасквіч - 2». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Зайчык». СССР, 1964 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.35** Фільм «Розныя лёсы». СССР, 1956 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля парадната пад'езду».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Асабістае». ЗША, 2008 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.30** Фільм «Чаму звар'яцеў спадар Р?». Германія, 1970 г.
**01.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**07.05** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.30** Авантурная камедыя «Мова святога» (Італія).
**09.25** Нашы тэсты.
**10.00** Школа рамонту.
**11.05** Жаночая ліга.
**11.45** Дакументальны фільм «Лінія жыцця. Лекары вайны» (Беларусь).
**12.15** «Правы чалавека».
**12.30** Музычная казка «Пра Чырвоны Капялюшык». 1-я і 2-я серыі.
**14.50** Дакументальны фільм «Лёс брамнікa» («Беларусьфільм»).
**15.20** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.30** Меладраматычны серыял «Несамотныя» (Расія-Украіна). 1-4, закл., серыі.
**19.50** Смешная часіна.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Жаночая ліга.
**21.15** Гангстэрская камедыя «Як рыбка без вады» (Францыя).
**22.55** Свая музыка. Працяг.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

**РОССИЯ**

**07.00** «ХА». Маленькія камеды.
**07.30** Фільм «Руская гульня». Расія, 2007 г.
**09.10** Тэлесерыял «Даішнікі». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.15** Фільм «Мой сябар - чалавек несур'ёзны».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Сумленны дэтэктыў».
**15.15** Фільм «Увага! Усім пастам…».
**16.50** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.15** «Экстрасэнс смеху. Сямён Альтаў». Дакументальны фільм.
**21.10** Лірычная камедыя «Вандраванне ў закаханасць». 2007 г.
**23.15** Фэст «Славянскі базар - 2010».
**00.25** Фільм «Галінка бэзу». 2007 г.

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая кроў».
**10.55** «Крамлёўскія жонкі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. «Лепшы горад зямлі».
**14.10** Фантастычныя прыгоды «Бібліятэкар-2: вяртанне ў капальні цара Саламона».
**16.00** Сёння.
**16.20** «І зноў добры дзень!».
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.05** Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**00.15** «Футбольная ноч».
**00.40** Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».

**EUROSPORT**

**09.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 7-ы этап.
**11.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**11.15** Веславанне. Кубак свету ў Швейцарыі (Люцэрн). Прамая трансляцыя.
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Прамая трансляцыя.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Брно). Заезд 1-ы. Прамая трансляцыя.
**13.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс». 8-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Брно).
**19.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Брно). Заезд 2-і.
**20.00** Матаспорт па выхадных.
**20.15** Веславанне. Кубак свету ў Швейцарыі (Люцэрн).
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Веславанне. Кубак свету ў Швейцарыі (Люцэрн).
**22.00** Бокс.
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд.
**01.05** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Чэхіі (Брно). Заезд 2-і.
**01.45** Матаспорт па выхадных.
**02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.05** «Быць беларусам, быць аптымістам», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**08.25** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «Dali».
**08.35** Чалавек-эпоха: «Кароль Уга», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**09.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.10** «Новы час», дак. фільм, Боснія-Герцагавіна.
**10.45** «Аблавушак», мультсерыял.
**11.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**12.00** «Адбыты тэрмін», маст. фільм, ЗША.
**17.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял.
**18.10** Дак. гадзіна: «Ганна, сем год на лініі фронту», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 1 серыя.
**19.25** Вагон.
**20.30** Басаножка па свеце.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Побач з намі.
**21.45** Фільматэка майстроў: «Знакамітасць», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**23.35** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у аддзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

ГЕАПАЛІТЫКА

# «ПАРТЫЗАНЫ» ЗМАГАЛІСЯ ЗА ДВР?

Іван БІЧ

**Эпапея з групоўкай так званых «партызан Прымор'я» ў Расіі справакавала цікавасць грамадства да праекту аднаўлення Далёкаўсходняй рэспублікі (ДВР) — незалежнай дзяржавы, якая існавала падчас грамадзянскай вайны.**




**Даведка:**
ДВР — Далёкаўсходняя рэспубліка (6 красавіка 1920 — 15 лістапада 1922 года) — афіцыйна незалежная і дэмакратычная дзяржава з капіталістычным укладам у эканоміцы, абвешчаная на тэрыторыі Забайкалля і Далёкага Усходу. Фактычна з'яўлялася буфернай дзяржавай паміж Савецкай Расіяй і Японіяй. Абвяшчэнне ДВР спрыяла прадухіленню прамога ваеннага канфлікту паміж Савецкай Расіяй і Японіяй і вываду замежных войскаў з тэрыторыі Далёкаўсходняга краю, 25 кастрычніка 1922 Чырвоная армія ўступіла ва Уладзівасток. Увечары 14 лістапада 1922 гады камандзіры яе частак ад імя Народнага сходу ДВР звярнуліся ў Маскву з просьбай уключыць ДВР у склад РСФСР. Спатрэбілася некалькі гадзін — і 15 лістапада незалежная рэспубліка стала Далёкаўсходняй вобласцю РСФСР.

Гісторыя вакол «партызан» вельмі туманная. Прыкладна на пачатку чэрвеня стала вядома, што ў адным з раёнаў Прыморскага краю дзейнічае ўзброеная апазіцыйная групоўка. На яе рахунку забойства міліцыянера, абстрэл службовых аўто супрацоўнікаў ДПС, падпал аддзелу МУС. Супраць групоўкі, якая складаецца з пяці чалавек, было адпраўлена прыблізна 200 байцоў спецназу, верталёты, БМП і г.д. У выніку двое з баевікоў забітыя. Іншыя знаходзяцца ў турме.

Нягледзячы на тое, што падзеі на Далёкім Усходзе ўвесь пачатак чэрвеня былі ў топе навінаў, комплекснай інфармацыі наконт ідэйных матываў учынкаў «партызан» няма.

Родзічы партызан кажуць, што іх сыны і ўнукі пайшлі ў лясы, каб адпомсціць за здзекі з боку міліцыі. У інтэрнэце ўжо з'явілася біяграфіі некаторых ахвяраў «партызан». Калі ім верыць, адзін з нябожчыкаў быў звязаны з наркамафіяй, другі «крышаваў» незаконны продаж лесу, трэці меў судзімасць.




Менавіта гэтая версія — хлопцы змагаліся супраць міліцэйскага гвалту — забяспечыла партызанам шалёную папулярнасць у Расіі. Нічога дзіўнага тут няма. Калі верыць часопісу «Эсквайр», з красавіка 2009 года ў краіне не было ніводнага дня, калі б міліцыянеры ў грубай форме не парушалі закон. Напрыклад, 29 красавіка 2010 года міліцыянер задушыў інваліда, 9 мая арыштаваны міліцыянер, які пазбавіў юнака галавы і г.д.

Ёсць увогуле вар'яцкая версія. Так, на ўкраінскіх нацыяналістычных сайтах можна прачытаць пра тое, што групоўка быццам складалася з этнічных украінцаў, якія змагаліся за аднаўленне ўкраінскай культурна-нацыянальнай аўтаноміі «Зялёны клін», якая існавала ў Прыморскім краі ў 1920-я гады.

Ёсць цалкам верагодная версія, што дасье групы прыдумалі ў МУС, каб павесіць на іх нераскрытыя справы з тымі ж абстрэламі, падпаламі і г.д. Не трэба забываць, што ўсё адбываецца ў Прымор'і. Адзін з блогераў рэагаваў на шуміху вакол «партызан» наступнай рэплікай: «Нават дзіўна: колькі жыў на Далёкім Усходзе, столькі там былі беглыя дэзерціры са зброяй, напады на міліцыю і ваенныя склады з мэтай авалодаць зброяй. І нічога».

Афіцыйная версія: банда «партызан» складалася насамрэч з рускіх нацыяналістаў і скінхедаў (нібы ў іх канфіскавалі адпаведную літаратуру). Іх маніфесты ў інтэрнэце сапраўды мільгацяць заклікамі змагацца не толькі з «ментамі», але і з «габрэйскім фашызмам», «ачысціць Расію ад чужынцаў».

Фрагмент заявы групы: «Мы падняліся на ўзброеную барацьбу супраць акупантаў нашай краіны. Мы падняліся супраць габрэйскага фашызму, як нашы дзяды і бацькі падняліся ў 1941 годзе супраць нямецкіх захопнікаў… Рускі баявы атрад Рамана Мурамцава — ветэрана баявых дзеянняў у Чачэнскай рэспубліцы — вядзе баявыя дзеянні супраць бандыцкай крамлёўскай групоўкі з 27 мая 2010 года».

Пры любым раскладзе канфлікт у дадатак меў яўна выражаны характар супрацьстаяння Масквы і рэгіёну. Лавілі «партызан» элітныя часткі з цэнтру, у той час як мясцовыя праяўлялі салідарнасць з ляснымі братамі. Апошняе спрыяла пашырэнню заклікаў да выхаду Далёкага Усходу са складу Расіі і хвалі настальгіі па часах ДВР.

Хаця ДВР была супярэчлівым дзяржаўным фармаваннем, міф пра яе вельмі папулярны сярод тутэйшых. Падчас кожнага больш-менш значнага грамадскага пратэсту ў краі супраць Масквы згадваюць пра ДВР. Апошні раз пра пагрозу сепаратызму на Далёкім Усходзе казалі ў 2008-м падчас пратэстаў мясцовых аўтамабілістаў супраць увядзення мытаў на імпарт іншамарак. Па сеціве нават гуляе праект канстытуцыі рэспублікі.

Чын прыморскіх «партызанаў» зноў выклікаў стары прывід. Галоўным чынам гэта папросту заклікі ў інтэрнэце да выхаду краю са складу Расіі. Аднак ёсць спробы абгрунтаваць пратэст супраць Масквы. Адзін з прыморскіх нацыяналістаў піша: «З 2000-х гадоў, пасля кардынальнай змены кірунку развіцця ўлады ў Маскве, новая заходняя палітыка дакацілася і да ДВ (Дальні Усход). Груба кажучы, маскоўскі палітызаваны і абсалютна карумпаваны бізнес, у пошуках новых крыніц узбагачэння, прыйшоў на Далёкі Усход. Яго ў грубай форме паслалі «на ...». З гэтага моманту ДВ увесь час пад прэсам з цэнтру. Непакорлівае насельніцтва змушаюць схіліць галовы і ўстаць на калені, «прызнаць новага цара» і адмовіцца ад сваіх вольнасцяў. Было знішчана ўсё, што дапамагала прыморцам зводзіць канцы з канцамі, папросту выжыць».

Такога шталту аргументацыя вельмі прымітыўная. Няма эканамічных абгрунтаванняў, няма спасылак на палітычную традыцыю. У выніку ўсё гаворыць пра тое, што рух за ДВР існуе на ўзроўні лозунгаў.

Так ці інакш, гэта другі званок для Масквы на працягу года. Нагадаем, што падчас бунту шахцёраў у Кузбасе ў красавіку таксама гучалі заклікі да выхаду краю са складу РФ і стварэння асобнай Заходняй Сібірскай Рэспублікі.

Цікава, што адначасова з інфармацыяй пра подзвігі «партызан» з'явіліся спекуляцыі пра тое, што прыхільнікаў ДВР падтрымлівае Кітай. Кітайская эміграцыя ў рэгіёне вельмі моцная, і стварэнне буфернай дзяржавы можна было б лагічна разглядаць як пачатак асцярожнай інтэграцыі краю ў склад Кітая на правах аўтаноміі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Расійска-беларускі газавы канфлікт у чарговы раз пераканаў — у палітыцы не бывае вечных сяброў і ворагаў, бываюць толькі вечныя інтарэсы. Менавіта гэты тэзіс лепш за ўсё дэманструе ўсю глыбінную сутнасць расійска-беларускага сяброўства. Калі ў кагосьці яшчэ засталіся ілюзіі адносна вялікай братэрскай любові Расіі, варта павярнуць галаву ў бок нашага заходняга суседа, трубы якога заставаліся без расійскага газу.

**«Украинская правда» (Украіна)**

Такое ўражанне, што ў Лукашэнкі істэрыка: лепш памерці стоячы, чым памерці на каленях. Справа ў тым, што цяперашняя эканамічная і палітычная сістэма Беларусі разлічана на расійскую датацыю.

**«Взгляд» (Расія)**

Пра тое, што намеры беларускага прэзідэнта менавіта такія — пераарыентавацца з Масквы на Кіеў, — кажуць яго заявы як апошняга, так і больш далёкага часу. Яшчэ некалькі гадоў таму Лукашэнка ўключыў у лік сваіх любімых рэфрэнаў наступную фразу: «Нас 55 мільёнаў — ад Балтыкі да Чорнага мора». «Нас» у гэтай фразе азначае, відавочна, грамадзян транзітных краін Украіны і Беларусі. Аматары капацца ў старых палітычных картах убачаць у гэтай тэрыторыі і Вялікае княства Літоўскае, і частку «санітарнага кардона», які некалі стваралі супраць савецкай Расіі лордам Керзонам. Яшчэ некалькі гадоў таму, пры антырасійскім рэжыме Віктара Юшчанкі, і беларускія нафтаправоды, і «Белтрансгаз» мелі б для Расіі велізарную цікавасць і каштавалі б значна больш. Антырасійскія выказванні Лукашэнкі з захапленнем падхапілі б Юшчанка і Цімашэнка. Але сёння ў Кіеве больш адэкватны (прынамсі, на словах) урад. Відавочна, антырускі настроены беларусаў і ўкраінцаў «ад мора да мора» ўсё ж не 55 мільёнаў. Тут Лукашэнка памыліўся.

**«РИА Новости» (Расія)**

Зрэшты, пакуль гэта ўсяго толькі «пражэкты», і ніякай рэальнай альтэрнатывы расійскім газу і нафце ў Лукашэнкі няма. Больш таго, планы Расіі пабудаваць трубаправод у Еўропу ў абыход Украіны і Беларусі прыкметна скарачаюць Мінску прастору для манёўру. Цяпер практычна адзіным сродкам ціснуць на Маскву для Лукашэнкі з'яўляецца пагроза перакрыць транзіт газу ў Еўропу. Беларускі лідэр выдатна разумее, што ў выпадку дыверсіфікацыі паставак расійскага газу яго магчымасці шантажаваць Крэмль будуць зведзены да мінімуму.

**«Новая политика» (Расія)**

Некаторыя на Захадзе задаюцца пытаннем, чаму Азербайджан зрабіў такі шчодры падарунак беларускаму лідэру. Па-першае, гэта не падарунак, а кароткатэрміновы крэдыт. Па-другое, Ільхам Аліеў тым самым хацеў нагадаць Крамлю, што Азербайджан не будзе вечна трываць зацягванне ўрэгулявання канфлікту вакол Нагорнага Карабаху. У сувязі з гэтым Азербайджан стварае пояс сяброўскіх славянскіх дзяржаў, якія маглі б дапамагчы ў выпадку пачатку баявых дзеянняў.

**AZE (Азербайджан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЗАХСТАН. КАРОВЫ АТАКУЮЦЬ ГАРАДЫ



Казахскія гарады сутыкнуліся з незвычайнай праблемай. Сельскія жыхары, якія шукаюць шчасця ў вялікіх гарадах, вельмі часта бяруць з сабою хатніх жывёл. Разам з курамі і сабакамі яны вязуць і кароў. У выніку ў гарадах часта можна пабачыць кароў, якія пасуцца сярод высокіх будынкаў. Паколькі травы ва ўрбаністычнай зоне няшмат, яны аблюбавалі сметнікі. Увогуле, людзі ставяцца да гэтага спакойна. Карова — жывёла мірная. Хіба толькі бамжы не задаволеныя — каровы на сметніках замінаюць ім выжываць. Аднак малако гэтых кароў наўрад ці можна лічыць якасным. Такая ж сітуацыя і з мясам. Што рабіць з жывёламі, мала хто ведае. Некаторыя кажуць, што скаціна на вуліцах цалкам адпавядае канонам нацыянальнай казахскай культуры.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### ПАР. НЕМАЎЛЯТ НАЗЫВАЮЦЬ ФУТБОЛЬНЫМІ ІМЁНАМІ

Ажыятаж вакол Кубку свету па футболу паўплываў на выбар бацькамі імёнаў для сваіх дзетак. Літаральна за тыдзень у краіне з'явілася шмат дзяцей, якіх назвалі імёнамі, звязанымі з футболам: Фіфа (у гонар Міжнароднай футбольнай асацыяцыі), Мексіка і Бафана (мянушка мексіканскай каманды), Сокер (амерыканская назва футболу). Шмат імёнаў даюць у гонар футбольных зорак. Дарэчы, надаванне імён у афрыканскай культуры лічыцца вельмі важным рытуалам. Адпаведна мясцовым рэлігіям, імя чалавека пазней вызначае яго лёс.

**Па матэрыялах «The Christian Science Monitor» (ЗША)**

### БРАЗІЛІЯ. «АВАТАР» СУПРАЦЬ ГЭС

Бразільскі прэзідэнт Лула да Сільва пасварыўся з Джэймсам Камеранам, стваральнікам фільму «Аватар».

Бразільскі гарант высмеяў учынак кінематаграфіста, які некалькі месяцаў таму падтрымаў пратэсты індзейскіх плямёнаў рэгіёну Амазонкі супраць праекту будаўніцтва ў сельве гідраэлектрастанцыі. З такім праектам зараз носяцца ў структурах бразільскага ўраду.

Па словах прэзідэнта, было б лепш, калі б Камеран дапамог разабрацца з сітуацыяй, якая ўзнікла ў Мексіканскім заліве з-за катастрофы на адной з нафтавых пляцовак.

Сваю заяву Лула да Сільва зрабіў падчас візіту ў горад Атаміра. Менавіта па суседству з ім плануецца пабудаваць амазонскую ГЭС. Падчас публічнай прамовы прэзідэнта атакавала група моладзі. Лула ў адказ заявіў, што, калі ён быў маладым, таксама пратэставаў супраць будаўніцтва адной ГЭС. Аднак цяпер, калі пасталеў, зразумеў, што быў дурнем. Па яго словах, тыя пратэсты фінансавалі аргенцінцы, якія не хацелі, каб Бразілія развівала сектар гідраэнергетыкі.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. ЛЕВЫЯ НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК

У самай вялікай зямлі ФРГ Ніжні Рэйн Вестфаліі нарэшце сфармаваны кабінет. У яго склад увайшлі сацыял-дэмакраты (SPD) і Зялёныя. Пры гэтым большасці ў зямельным парламенце новы ўрад не мае. Аднак плануе карыстацца галасамі іншых партый, і перш за ўсё партыі Левых. Такі фармат кааліцыі шмат хто з экспертаў разглядае як абкатку мадэлі будучага федэральнага ўраду. Справа ў тым, што прысутнасць левых у складзе ўраду выклікала б скандал. Шмат хто на захадзе краіны дасюль лічыць Левых нашчадкамі Аб'яднанай сацыялістычнай партыі Германіі (афіцыйная партыя ў ГДР). У шэрагах сацыял-дэмакратаў таксама не забыліся, што Левыя паўсталі як саюз былых камуністаў і часткі SPD. А вось падобны фармат — Левыя не атрымліваюць партфелі міністраў, аднак неафіцыйна за нейкія прэферэнцыі падтрымліваюць урад, — быццам задавальняе ўсіх. Праўда, урад меншасці застаецца ўрадам меншасці. Дастаткова любога капрызу з боку Левых, каб пачаўся ўрадавы крызіс з усімі адпаведнымі наступствамі.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### УЗБЕКІСТАН. БЕЛАРУС УЗЯЎ ТАШКЕНТ

145 гадоў таму, 28 чэрвеня (16 чэрвеня па старым стылі) 1865 года, завяршыўся штурм Ташкента рускімі войскамі пад камандаваннем генерал-маёра М.Г. Чарняева. Захоп самага буйнага з сярэднеазіяцкіх гарадоў, які знаходзіўся на перакрыжаванні асноўных гандлёвых і транспартных шляхоў, стаў важным этапам расійскай экспансіі ў паўднёвым кірунку. Героем штурму быў, зразумела, Міхаіл Чарняеў, які нарадзіўся ў Магілёўскай губерні ў небагатай шляхецкай сям'і. Ён прасунуўся на пасаду генерала пасля ўдзелу ў падаўленні венгерскага паўстання і Крымскай кампаніі. Цікава, што Ташкент быў захоплены Чарняевым без санкцыі цэнтру. Пры гэтым трэба прызнаць, царскія войскі не шкадавалі праціўніка і мірнае насельніцтва. За захоп Ташкента вайскоўцу была падараваная залатая шабля. Дарэчы, далёка не ўсё ў Пецярбургу зразумелі значэнне захопу самага вялікага горада ў Сярэдняй Азіі. Аднак учынак Чарняева ацаніў Лондан — рэгіянальны канкурэнт Расіі. Ён дабіўся адклікання Чарняева з Сярэдняй Азіі. У 1898 годзе той памёр у сваім маёнтку пад Магілёвам.

**Па матэрыялах узбекскіх сайтаў**

**ВЫБАРЫ**

# ЗЯЛЁНАЕ ЦУНАМІ

*Алег ПЯТРОЎ*

**У Калумбіі афіцыйны кандыдат ледзь не прайграў палітыку, які пачаў палітычную кар'еру з таго, што зняў штаны на публіцы.**

Напрыканцы лютага ў Калумбіі адбыўся палітычны землятрус. Канстытуцыйны трыбунал заблакаваў праект рэферэндуму, які фактычна адчыняў прэзідэнту Альвара Урыбе дарогу да трэцяй кадэнцыі.

Мала хто сумняваўся, што, у выпадку дазволу яму балатавацца ў трэці раз на пасаду прэзідэнта, Урыбе пераможа. Пасля таго, як Альвара перамог на выбарах 2002 года, яго рэйтынг ніколі не падаў ніжэй за 60 працэнтаў.

Усё дзякуючы паслядоўнай пазіцыі ў адносінах да партызанскіх камуністычных груповак FARC (узброеныя народныя сілы Калумбіі) і ELN (Народна-вызвольнае войска), якія з 1960-х гадоў спрабуюць са зброяй у руках стварыць сацыялістычную Калумбію. Дзякуючы тэме барацьбы з тэрарызмам Урыбе хутка знайшоў агульную мову з адміністрацыяй Джорджа Буша-малодшага. Другая прычына сяброўства з Белым домам — мода на левых палітыкаў, якая ахапіла кантынент. Амаль ва ўсіх краінах Лацінскай Амерыкі за апошняе дзесяцігоддзе да ўлады прыйшлі левыя. Адзіным бастыёнам правага лібералізму засталася Калумбія, якая ў падобнай сітуацыі магла разлічваць на дапамогу янкі.

Сапраўды, ЗША пачалі крэдытаваць рэжым Урыбе, пастаўляць яму зброю, адкрылі тут свае базы. Дапамога звонку дазволіла адміністрацыі Урыбе адцясніць партызан у сельву, стварыць імідж бяспечнай краіны (першая ўмова для інвестараў і турыстаў).

Аднак, як бачым, нягледзячы на харызму Урыбе і ўсе поспехі яго рэжыму, канстытуцыю яму перапісаць не далі. Зрэшты, у Калумбіі самая старэйшая дэмакратыя ў Лацінскай Амерыцы.

Навіна пра тое, што Альвара не ідзе на чарговы тэрмін, не выклікала хаосу. У прэзідэнта даўно быў гатовы пераемнік — былы міністр абароны, віцэ-прэзідэнт Хуан Мануэль Сантас. Ён праславіўся перш за ўсё шэрагам атак на фармаванні FARC. У спісе ягоных подзвігаў у тым ліку вызваленне з палону FARC закладніцы Інгрыд Бетанкур (калумбійская і французская грамадзянка), ліквідацыя нацыянальнага тэрарыста нумар два Рауля Рэйеса падчас рэйду калумбійскага спецназу на партызанскую базу на тэрыторыі Эквадору.

Трэба дадаць, што сям'я Сантасаў паходзіць са старой дынастыі выдатных палітыкаў і інтэлектуалаў. Ягоны прадзед быў прэзідэнтам краіны ў 1930-я гады. Сантасы заснавалі самую папулярную ў краіне штотыднёвую газету «El Tiempo».

Адразу пасля таго, як Сантас уступіў у кампанію, яго імя апынулася ў топе кандыдатаў.

І тут пачаліся цуды Майсея. Маем на ўвазе феномен Антанаса Моцкуса — былога прафесара матэматыкі, экс-мэра сталіцы і нашчадка эмігрантаў з Літвы («Моцкус» — па-літоўску «Майсей»).

Пачынаў Моцкус сваю палітычную кар'еру дастаткова экзатычна ў кастрычніку 1993 года. Тады ён — выкладчык Нацыянальнага універсітэта — павінен быў выступіць перад вялікай аўдыторыяй. Студэнты яму не давалі слова сказаць. У адказ прафесар паказаў ім свой зад. Публіка адразу супакоілася.

Пра ўчынак вучонага казала ўся краіна. На гэтым акадэмічная кар'ера Моцкуса закончылася. Затое пачалася палітычная. Праз два гады Антанас без вялікіх грошай перамог на выбарах сталічнага мэра.

На пасадзе кіраўніка гарадской адміністрацыі ён дзейнічаў як навуковец. На думку Моцкуса, праблема калумбійскага грамадства палягала ў тым, што людзі баяцца ўлады. Як следства — закон ім замяняюць традыцыі і звычаёвае права.

Каб вярнуць давер да дзяржавы, бургамістр прыдумаў шэраг акцый: замест паліцэйскіх па вуліцах хадзілі клоуны-мімы. Яны жартавалі з людзей, якія парушалі грамадскі парадак. Сам Моцкус прыдумаў сабе персанаж з серыі супергерояў — «суперабывацель». Суперабывацель збіраў смецце і г.д. Каб людзі маглі каналізаваць негатыўную энергію, паставіў на кожным кроку баксёрскія грушы.

Такія спектаклі, як ні дзіўна, выклікалі рост грамадзянскага сумлення, самарэфлексіі. Дзякуючы адначасовай кампаніі супраць карупцыі і скарачэння падаткаў на ўтрыманне паліцыі, папулярнасць Моцкуса вырасла. Калі Моцкус сыходзіў пасля дзвюх кадэнцый з пасады мэра Багаты, яму было чым ганарыцца. Хаця б тым, што колькасць забойстваў у традыцыйна вельмі крыміналізаванай калумбійскай сталіцы скарацілася ў чатыры разы. Таксама на парадак зменшылася ўжыванне наркотыкаў. Узнікла сетка хуткага гарадскога транспарту. Давер да мэрыі быў такі высокі, што 63 тысячы жыхароў нават пагадзілася заплаціць у гарадскую казну суму, большую за звычайны падатак.

Яшчэ падчас знаходжання на пасадзе мэра Багаты Моцкус двойчы спрабаваў ісці ў прэзідэнты. Аднак кожны раз збіраў толькі пару працэнтаў. Ён нават умудрыўся перамагчы ў масавым апытанні «палітык, які, хутчэй за ўсё, ніколі не будзе прэзідэнтам».

Аднак былы выкладчык не здаўся. Год таму ён заснаваў Партыю Зялёных, якая здолела на выбарах прайсці ў парламент. Адразу пасля выбараў Моцкус зноў заявіў пра свае прэзідэнцкія амбіцыі. На старце кампаніі Моцкуса бачылі на пасадзе лідэра краіны толькі некалькі працэнтаў выбаршчыкаў. Бум пачаўся пасля таго, як яго кандыдатуру нечакана падтрымаў былы мэр горада Медэлін. Дарэчы, ён таксама быў прафесар матэматыкі. Тандэм прыдумаў незвычайны лозунг сваёй кампаніі: «Матэматыкі, якія дадавалі, пачынаюць памнажаць».

Чамусьці навіна пра саюз двух матэматыкаў выклікала ажыятаж. На Facebook у Моцкуса было больш сяброў, чым у Барака Абамы ў час, калі ён змагаўся за Белы дом. Увогуле, гэта пяты па папулярнасці палітык у інтэрнэце.

Так ці інакш, рэйтынг Моцкуса пачаў расці вялікімі тэмпамі. У прэсе нават з'явіўся выраз «зялёнае цунамі».

Нельга казаць, што Моцкус быў чыстым папулістам. Фішкамі ягонай кампаніі былі барацьба з карупцыяй і паліцэйскім гвалтам, дыялог з суседнімі дзяржавамі.

Сваю ролю адыгралі і негатыўныя рысы афіцыйнага кандыдата. Калісьці Сантас здрадзіў роднай партыі лібералаў. На пасадзе міністра абароны неаднаразова быў вымушаны адказваць журналістам за забойства падрадкаванымі яму людзьмі грамадзянскага насельніцтва падчас антыпартызанскіх аперацый.

У выніку за тыдзень да выбараў рэйтынгі Хуана Сантаса і Антанаса Моцкуса зраўняліся. Абодва мелі па 30 працэнтаў.

Надышло 30 мая — дзень галасавання, які падараваў новую сенсацыю. Моцкус атрымаў значна менш, чым чакалі, — толькі 21 працэнт. У той жа час Сантас, насуперак усякім прагнозам, узяў планку ў 41 працэнт.

Эксперты адразу пачалі шукаць прычыны канфузу Зялёных. Безумоўна, сваю ролю адыграў подкуп уладамі галасоў выбаршчыкаў — папулярная практыка на калумбійскіх выбарах, асабліва ў правінцыі.

Аднак у Моцкуса хапала хібаў. Кажуць, што ён дарэмна крытыкаваў паслядоўную лінію Сантаса адносна інсургентаў. І дарэмна праявіў сябе як заўзяты інтэлектуал: ён адмовіўся адказаць на пытанне, ці верыць ён у Бога (Калумбія — каталіцкая краіна).

Аднак найбольшым правалам была ягоная заява пра гатоўнасць выдаць Урыбе эквадорскім уладам, калі іх суд прызнае прэзідэнта адказным за згаданую вышэй атаку спецназу Калумбіі на базы FARC у Эквадоры. Такое стаўленне патэнцыйна будучага прэзідэнта да папярэдніка шмат хто палічыў не вельмі этычным.

Мядзведжую паслугу зрабіў кандыдату Зялёных напярэдадні другога туру Уга Чавес. Ён прыгразіў замарозіць гандаль паміж Калумбіяй і Венесуэлай, калі калумбійцы абяруць на пасаду прэзідэнта Сантаса. Гэта выклікала сярод электарату выбух патрыятызму, ахвярай якога стаў Моцкус.

Другі тур 20 чэрвеня быў абсалютна фармальным. Сантас — 63 працэнты. Моцкус — 35 працэнтаў.

Ці значыць, што на гэтым кар'ера 58-гадовага Антанаса Моцкуса закончылася? Нельга сказаць, пакуль мы не зразумеем, што ўяўляе сабою прэзідэнт Сантас.

У Моцкуса ёсць прастора для развіцця. Шмат хто з мясцовых каментатараў назваў дуэль Моцкуса і Сантаса дуэллю інтэрнэту і тэлебачання. Праціўнік лідэра Зялёных аддаваў перавагу не ворнага кшталту «Одноклассникам», а выступам на вядучых папулярных каналах. Калі Зялёныя змогуць захапіць ініцыятыву ў інтэрнэце, колькасць карыстальнікаў якога расце, шанцы на будучае ў іх вельмі добрыя.

ЦІКАВА

# ЦІ ЛЮБЯЦЬ ГРУЗІНЫ СТАЛІНА?

Алег НОВІКАЎ

**Дэмантаж помніка Сталіну на яго радзіме ў горадзе Горы выклікаў шырокую палеміку наконт цяперашняга стаўлення грузін да асобы правадыра народаў.**



Сам помнік генералісімусу знялі ўначы, вельмі хутка і пры малым супраціве. Толькі 30 камуністаў выйшлі на абарону манумента. Абаронцы сцвярджаюць, што калі б манумент дэмантавалі ўдзень, народу было б значна больш.

Улады тлумачаць неабходнасць дэмантажу вельмі проста: у XXI стагоддзі ў цэнтры краіны, якая бачыць сябе сябрам ЕС, не можа быць помніку дыктатару. Дарэчы, на месцы Сталіна плануецца паставіць помнік ахвярам расійскай агрэсіі жніўня 2008 года. Што да помніка, які дэмантавалі, то яго зробяць фрагментам экспазіцыі «Музея ахвяр расійскай і савецкай акупацыі». У гэты комплекс увойдзе і частка дома-музея Іосіфа Сталіна, які знаходзіцца ў тым жа Горы.

«Мы не можам адкрываць музей акупацыі Грузіі і пакідаць помнікі арганізатарам той самай акупацыі. У нашай краіне не могуць адначасова існаваць манументы героям, якія аддалі жыццё ў барацьбе супраць сістэмы, і помнікі тым, хто знішчыў вялікую частку нашай інтэлігенцыі», — заявіў прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі. Адначасова ён абвясціў пра пачатак у Грузіі новай эпохі — «эпохі без правадыра народаў».

Аднак шмат што ў рыторыцы ўладаў не клеіцца. Праблема стаўлення да асобы Сталіна ў грузінскім грамадстве відавочна значна больш складаная.

Як прыклад, дадзеныя апытання, якое правяло ў верасні 2009 года па замове рэдакцыі грузінскага штотыднёвіка «Квірыс палітра» («Палітра тыдня») адно мясцовае сацыялагічнае агенцтва. Грузінаў пыталіся пра іх стаўленне да ідэі дэмантажу помніка Сталіну. Тады большасць (68,4%) выказалася «супраць», а 13,8% — «за».

Такія настроі на першы погляд цалкам зразумелыя. Грузінамі рухаюць нацыяналістычныя матывы, якія нарадзіліся не на пустым месцы.

Хаця Сталін заўсёды быў паслядоўным праціўнікам праекту Грузінскай дэмакратычнай рэспублікі (1918–1921), маштаб ягонай асобы не параўнальна большы ў праекцыі на бацькоўскай грузінскай незалежнасці. Акрамя таго, сярод насельніцтва, асабліва старых людзей, моцная настальгія па савецкіх часах. У рэспубліцы, якая атрымлівала датацыі з цэнтру, быў неблагі ўзровень жыцця.

А пасля XX з'езду КПСС Сталін увогуле стаў складовай часткай мясцовага нацыяналізму. У Грузіі ўзнялася хваля пратэсту супраць «выкрыцця культу асобы Сталіна», якое праводзіў Мікіта Хрушчоў. У сакавіку 1956 года масавыя выступленні адбыліся ў Тбілісі, Батумі, Сухумі і Руставі. 2 сакавіка ў сталіцы Грузіі сотні студэнтаў і школьнікаў патрабавалі аднавіць «добрае імя Сталіна». Натоўп расстралялі. А пратэст 9 сакавіка ў грузінскай сталіцы быў задушаны пры дапамозе танкаў.

Гісторык Лёў Балаян так піша пра тыя падзеі: «Складана было Хрушчову дэмантаваць помнікі Сталіну ў сталіцы Грузіі: насельніцтва арганізавала вакол іх кругласутачнае дзяжурства. Уладам давялося пайсці на «вайсковую хітрасць»: была абвешчана «атамная паветраная трывога». Тым часам, пакуль наіўныя грузіны хаваліся ў бамбасховішчах і вуліцы апусцелі, салдаты дэмантавалі ўсе тры манумента. Адзіны помнік І.В. Сталіну, які атрымалася тады абараніць, і які захаваўся і дагэтуль, стаяў у Горы, на радзіме правадыра».

З улікам усяго сказанага, учынак Саакашвілі разглядаюць напросту як кан'юнктурны палітычны жэст. Звяртае ўвагу і тое, што дэмантаж помніка дзіўным чынам прыпаў на візіт прэзідэнта Расіі ў ЗША.

Некаторыя кажуць пра праяву звычайнай русафобіі. У прынцыпе, помнік ахвярам «рускай агрэсіі» сапраўды можна было ўсталяваць дзе хочаш, у якім заўгодна месцы, нават у Тбілісі, на праспекце Шата Руставелі. Але ўлады абралі менавіта Горы, менавіта цэнтральную плошчу, менавіта месца, звязанае з асобай Сталіна, якога так любіць просты рускі абывацель.

Некаторыя аглядальнікі бачаць у акцыі Саакашвілі праяву рэўнасці да папулярнасці Пуціна. Розніца паміж Расіяй і Грузіяй толькі ў тым, што расійскае грамадства амаль здабыло палітыка, партрэт якога гатова «павесіць на сцяну» замест сталінскага. У той час, як ніводны грузінскі лідэр пакуль нават блізка не дасягнуў узроўню папулярнасці лепшага сябра ўсіх савецкіх фізкультурнікаў.

У сваю чаргу, афіцыйная грузінская прэса кажа, што часы культу асобы ў Грузіі мінулі. Нават прапануецца блок доказаў.

Па-першае, часы мяняюцца — змяняюцца і погляды. З крахам савецкага рэжыму сталі вядомыя шматлікія, факты і лічбы, што пацягнула за сабой рэзкі «абвал сталінскіх рэйтынгаў», — піша блізкая да адміністрацыі Саакашвілі газета «Грузія сёння». Яна спасылаецца на выніку праведзенага ў Грузіі апытання. Рэспандэнты паставілі Сталіна толькі на трэцяе месца пасля Давіда Будаўніка і царыцы Тамары.

Па-другое, Сталіна любяць толькі ў Горы, які корміцца з турыстаў-сталіністаў. Тая ж «Грузія сёння» адзначае: «Кажучы пра стаўленне грузінаў да Сталіна, варта «падзяліць» краіну на дзве часткі: Горы, месца, дзе ў 1878 годзе нарадзіўся маленькі Сасо Джугашвілі, і астатнюю частку Грузіі, у якой Іосіфа Сталіна разглядаюць як неадназначную асобу расійскай і грузінскай гісторыі».

Папулярны і тэзіс пра тое, што Сталін больш належыць да расійскай, чым да грузінскай гісторыі. Нават на ўзроўні палітычнай культуры і свядомасці. Вядома захапленне Сталіна асобамі Пятра Першага і Івана Жахлівага — канструктарамі Расійскай імперыі.

Што да падзей 1956 года, то, на думку антысталіністаў, галоўным чыннікам пратэстаў была прысутнасць у выступах Хрушчова антыгрузінскай рыторыкі. Крытыка Сталіна з боку Хрушчова выпадкова выклікала адчуванне нацыянальнага прыніжэння.

Нарэшце, як піша ўрадавая прэса, ні адзін грузін не будзе любіць Сталіна, паколькі менавіта ён заклаў бомбу пад грузінскае дзяржаўнае адзінства, даўшы санкцыю на стварэнне абхазскай і паўднёвай асецінскай аўтаномных рэспублік. У выніку быццам тое рашэнне і прывяло да цяперашніх сепаратысцкіх канфліктаў.

Цяжа казаць, хто ў гэтай спрэчцы мае рацыю. Тыя, хто кажуць, што Сталін дасюль кумір грузінаў. Або тыя, хто сцвярджае адваротнае. У любым выпадку, ёсць сэнс узгадаць адзін факт. У 1989 годзе, калі прыехаўшыя з Тбілісі нацыяналісты паспрабавалі разбурыць помнік Сталіну, на яго абарону са зброяй у руках выйшла амаль усё насельніцтва Горы. У 2010-м пастамент бацькі народаў абаранялі ўсяго 30 чалавек.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РОБЕРТ БЕРД



Самы стары сенатар у гісторыі кангрэсу ЗША памёр ва ўзросце 92 гадоў. Нябожчык быў адным з самых уплывовых палітыкаў ЗША. У парламенце ён засядаў аж з 1953 года. Цікавая палітычная біяграфія сенатара. Ён прыйшоў у палітыку як пераканаты расіст. Нават быў лідэрам рэгіянальнага Ку-клукс-клану. Галасаваў супраць надання чарнаскурым амерыканцам грамадзянскіх правоў у 1964-м. У Кангрэсе спачатку працаваў у кансерватыўнай фракцыі партыі дэмакратаў. Актыўна выступаў за ўдзел ЗША ў вайне ва В'етнаме. Пасля абрання ў сенат Берд зацікавіўся левымі дактрынамі. Хутка стаў правай рукой Эдварда Кенэдзі — самага радыкальнага дэмакрата. Адначасова Берд стаў старшынёй фракцыі. Будучы сенатарам, на доўгі час Берд стаў самым вялікім знаўцам парламенцкіх працэдур, у тым ліку блакіравання законапраектаў. Напрыканцы свайго жыцця Берд канчаткова скаціўся на левыя пазіцыі — увесь час патрабаваў вывесці амерыканскія войскі з Іраку. Прычым ягоныя погляды лічыліся радыкальнымі нават сярод дэмакратаў.

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстану паказаў сябе добрым музычным крытыкам і нават прадзюсерам. Менавіта Назарбаеў стаў патронам першага казахскага мюзікла, прэм'ера якога 28 чэрвеня адбылася ў Астане. Мюзікл так і называецца: «Астана». Сюжэт дастаткова цікавы. Японская дзяўчына Асамі прыехала ў Казахстан па наказе дзядулі-самурая. Падчас другой сусветнай вайны дзядулю выхадзіла простая казахская жанчына. У казахскай сталіцы японка пазнаёмілася з казахам Арманам. Але Асамі спадабалася таксама буйному японскаму прадпрымальніку, які не збіраецца яе нікому саступаць. Пастаноўка была заказана вядучым еўрапейскімі і расійскімі кампазітарам і харэографам. Трупа складаецца з 200 акцёраў. Шыкоўныя дэкарацыі ўяўляюць сабой трохпавярховыя дамы ў разрэзе. Першым ацаніў мюзікл прэзідэнт. Пабачыўшы прэм'еру, ён аўтарытэтна сказаў, што «Астана» — вялікая падзея ў культурным жыцці Казахстана. Менш аптымістычныя каментары на інтэрнэт-форумах. Простыя казахі баяцца, што іхніх дзяцей, вучняў школ і студэнтаў, па разнарадцы абавязкова прымусяць наведаць шоу.

### ЦІЛА САРРАЦЫН



Сябра партыі сацыял-дэмакратаў і былы міністр берлінскага ўраду дазваляе сабе абсалютна не карэктныя ўчынкі. Так, ён заявіў, што турэцкая грамада Германіі — вытворцы дзяцей, а не эканамічны чыннік. І вось новы скандал. Выступаючы на адной сустрэчы прадпрымальнікаў, Саррацын паведаміў пра тое, што эмігранты маюць дрэнную адукацыю не з прычыны таго, што ў іх на радзіме адукацыйная сістэма кепская. А таму, што ў іх ад прыроды слабыя мазгі. Больш таго, немцы, па словах Саррацына, павінны баяцца наплыву неадукаваных эмігрантаў, паколькі «мы будзем дурнымі, калі іх будзе тут большасць». Заявы Ціла адразу выклікалі негатыўную рэакцыю з боку вядучых палітыкаў, уключаючы канцлера Ангелу Меркель. «Дурная і бесперспектыўная заява», — сказала яна. Высновы Саррацына сапраўды спрэчныя. Як паведамляе настаўніцкае выданне «Lettre International», менавіта дзеці габрэйскіх эмігрантаў з Усходняй Еўропы маюць самы высокі IQ сярод нямецкіх школьнікаў. Між тым, ходзяць чуткі, што Ціла не проста чэша языком. Ён хацеў бы імпартаваць у ФРГ партыйную мадэль нідэрландскай партыі лібералаў, якая паспяхова эксплуатуе ксенафобскую рыторыку.

ФЭСТ

# БЕЗ НАРВІЛІШАК ГЭТА БУДЗЕ НЕ «BE2GETHER»

Алесь ГІНЗБУРГ

**З 25 па 27 чэрвеня ў памежнай беларуска-літоўскай вёсцы Нарвілішкі адбыўся ўжо традыцыйны музычны фестываль «Be2gether». Сотні аматараў музыкі з Беларусі, Літвы і прылеглых да іх краінаў сабраліся на вялікім полі, каб увасобіць галоўную ідэю мерапрыемства — роўнасць і еднасць, незалежна ад узросту, нацыянальнасці, колеру скуры і прыналежнасці ці не да ліку грамадзян Еўрасаюза.**





Трэці дзень фестываля сустрэў нас сонцам, радасцю і новымі культурнымі прапановамі



Хто дэманстраваў разуменне таго, што на полі прысутныя беларусы, прычым, шчырыя беларусы, быў украінскі гурт "Гайдамакі". Каманда ўжо мела досвед падтрымкі беларускай незалежнай думкі, бо выступала на фэсце «Be Free" ў Львове ў жніўні 2008 года. Паводле прэс-рэлізаў «Гайдамакі", ці, лепей, «Haydamaky" працуюць у актуальным цяпер стылі «балканскі рок"



Калі б не мова некаторых кампазіцый, нацыянальную прыналежнасць латышскага гурта «Instrumenti", які спявае, апрануўшыся ў касцюмы мішак-пандаў, вызначыць было б немагчыма

## Люлька Сталіна

Фестываль «Be2gether» па сваёй сутнасці — гэта кактэйль з шоу-бізнесу, культурніцкага рамантызму і кампаніі па барацьбе за правы чалавека. На выхадзе атрымліваецца вельмі спецыфічная атмасфера закрытай клубнай вечарыні пад адкрытым небам. Страціўшы дзесяць гадзін на тое, каб пераадолець нейкія 250 кіламетраў ад дома да месца фестывалю і прайшоўшы ўсе памежныя кантролі, ты трапляеш у месца, дзе любая падобная падзея здавалася б немагчымай. Але менавіта праз гэту немагчымасць усё і адбываецца.

Нарвілішкі — вёска, што месціцца ў знакамітым анклаве Літвы ў тэрыторыі Беларусі. Паводле старога анекдоту, падчас падзелу тэрыторыі СССР на межы Іосіф Сталін паклаў у гэтым месцы на мапу люльку, а картограф так баяўся ГУЛАГу, што не адважыўся ссунуць яе крыху на поўдзень…

Тут некалькі год таму літоўскі бізнесовец Гедрус Клімкявічус купіў і адрэстаўраваў рэнесансны замак, які не проста знаходзіцца ў памежнай зоне, а ўпрытул падыходзіць да дзяржаўнай мяжы. З цягам часу яму стала сумна сузіраць усю гэтую прыгажосць на самоце. Было прынята рашэнне прыцягнуць размаітую публіку ў анклаў, — а заадно і далучыць да праблемы анклаву. Менавіта таму, нягледзячы на камерцыйную немэтазгоднасць ператвараць такі глухі кут у фестывальную пляцоўку, месца сваёй дыслакацыі, па словах арганізатараў, «Be2gether» не памяняе.

«Фестываль нарадзіўся тут, у Нарвілішках, — кажа Эгле Рэмеікайтэ, маркетынг-менеджэр праекта, — без Нарвілішак гэта будзе ўжо нейкі іншы фестываль, не «Be2gether». Гаворка не пра палітычныя сістэмы — гаворка пра людзей. Жыхары гэтага анклаву адрэзаныя мяжой ад сваіх родных у Беларусі: яны жывуць у суседніх вёсках, але не могуць бачыцца». Сімвалам уз'яднання сем'яў на памежнай тэрыторыі каторы ўжо год стаецца супольнае беларуска-літоўскае свята музыкі, мастацтваў і добрага настрою.



Што да Аліны Арловай — маладой зоркі літоўскай сцэны — яе выступ выклікаў у публікі не менш бурныя, але іншыя па спосабе выслаўлення эмоцыі. Кранальныя кароткія кампазіцыі, выкананыя пад піяніна вельмі моцным голасам, суправаджаліся відэаролікамі з жыцця простых людзей: раніШнік у дзіцячым садку, дом састарэлых, зэкі на зоне хваляцца татуіроўкамі…

## Што ні край, то абычай

Цікава, што патэнцыйныя наведнікі фестывалю з Беларусі і Літвы па-рознаму ўспрымаюць гэту падзею. Для беларусаў «Be2gether», поруч з польскім «Басовішчам» і ўкраінскім «Be Free» — адзін з замежных фэстаў, дзе, тым не менш, можна пачуць незалежных айчынных выканаўцаў, і, чаго граху таіць, падтрымаць куміраў, уволю намахаўшыся нацыянальнай сімволікай.

Палітычны кантэкст абавязковы для беларусаў — інакш няясна, чаму ўвогуле ладзіць нешта такое на беларуска-нейкай мяжы. Ад гэтага стэрэатыпу стараюцца адыйсці беларускія менеджэры праекту. З літоўскага ж боку пра такую спецыфіку ўспрыняцця фэсту ў Беларусі ўвогуле не задумваюцца. Па словах Эгле Рэмеікайтэ, увага літоўскай публікі нязменна прыцягнутая да «Be2gether», бо гэта самы вялікі оўпэн-эйр фестываль у Літве. Літоўцы едуць, каб пачуць модную ў гэтым сезоне айчынную і сусветную музыку.

Адчуваецца розніца і ў кантынгенце, які сцякаецца на фэст з дзвюх краінаў. З Літвы едуць людзі студэнцкага, а то і наўпрост школьнага веку. Беларускаму школьніку ці студэнту адважыцца на замежны вояж складаней, таму сярэдні ўзрост беларускіх наведнікаў з выгляду год на 5 вышэйшы. «Літоўцы сталага веку, — кажа Эгле Рэмеікайтэ, — былі ў захапленні ад спісу выступоўцаў, але іх не задаволілі паходныя ўмовы, у якіх даваўлося б жыць: намётавае мястэчка, душ на вуліцы…» У той жа час мела месца сумная акалічнасць «Be2gether»: безліч беларусаў, якія купілі білеты на фестываль, скарысталіся імі, каб адкрыць бясплатныя візы і павандраваць у гэты час па Еўропе — па сваёй, так бы мовіць, праграме.

Такім чынам, калі перад вамі расслабленыя 20-гадовы юнак у афрыканскіх фенечках або бэйбус спартовага целаскладу, увесь перамазаны фірмовай be2getherскай гразёю са спецыяльнага басейна, — то ён хутчэй за ўсё з Вільні або Коўна. Калі ж перад вамі засяроджаны 30-гадовы таварыш з прамым сталёвым позіркам, — ён, верагодна, з Гродна або Мінску. Апроч таго, нацыянальная прыналежнасць беларуса амаль абавязкова прапісаная на яго майцы. «Нельга сказаць, што на фестывалі зусім няма «беларусаў як літоўцаў», — кажа Алеся, фестывальшчыца са стажам, — але іх заўважна меней. У асноўным прыязджаюць "свядомыя", якія лічаць наведванне такіх мерапрыемстваў сваім абавязкам».

У выніку невялікая адносна нават папярэдніх гадоў колькасць удзельнікаў, хоць і засмуціла арганізатараў, паспрыяла камфорту тых, хто даехаў. Фестывальныя дні праходзілі ў атмасферы «меней народу — болей кіслароду».

«Выбіраючы хэдлайнераў для сёлетняга фестывалю, — кажа Эгле Рэмеікайтэ, мы арыентаваліся на густы публікі па абодва бакі мяжы. Але, вядома ж, усім дагадзіць немагчыма». Напрыклад, навіна пра тое, што ў Нарвілішках выступіць гурт «Empire of the Sun» выклікала безліч захаплення ў літоўцаў. А вось гурт «Skunk Anansie» апынуўся культавым сярод беларусаў, аднак літоўцы яго віталі стрымана. «Гэта нармальная сітуацыя, — тлумачыць Эгле, — розныя краіны, розныя інфаканалы, розныя традыцыі спажывання музыкі». Апроч таго, арганізатары імкнуліся прадставіць усе накірункі музыкі: рок, хіп-хоп, фолк, ды-джэінг.

## Музыка без межаў

Наведнікамі фестывалю сталі таксама латышы, палякі, расіяне, украінцы. Было даволі шмат наведнікаў з Вялікабрытаніі — дзякуючы танным авіяперапётам у Літву. Усе гэтыя нацыі, па словах арт-менеджэра галерэі «Ў» Ганны Чыстасердавай, пабывалі за час фестывалю ў павільёне галерэі: «Мы працавалі фактычна круглыя суткі. З пятніцы на суботу фактычна да шостай ранку ў нас адбывалася свята. Я не магу сказаць, што літара «Ў» прывабіла больш беларусаў, чым замежнікаў». Дэвіз фестывалю — «Музыка адчыняе межы» — Ганна гатовая напісаць і на сваім шчыце: «Наш павільён быў супольным, беларуска-літоўскім. Тут выступалі ды-джэі з абедзвюх краінаў, мы ладзілі інтэрнацыянальныя паэтычныя слэмы». Беларускія гурты «Akute» ды «Cherryvata», адвыступаўшы на фестывальных пляцоўках, ладзілі тут акустычныя выступы. «Гэта вельмі добра, што запрасілі так шмат гуртоў з Беларусі, гэта добры прамоўшн для нашай музыкі».

Адзін з галоўных прынцыпаў фестывалю — празрыстасць. Гаспадар фестывалю Гедрус Клімкявічус адкрыў свой замак для наведнікаў, а сам лічыў за лепшае злівацца з фестывальным натоўпам, адмаўляючыся ад інтэрв'ю. «Вы лёгка яго пазнаеце. Ён нечым падобны да Шрэка і ўвесь свеціцца ад задавальнення», — інструктуюць у прэс-цэнтры. Незаўважнасць арганізатараў стварала ілюзію, што на «Be2gether» усё адбываецца само сабою, хоць, вядома ж, за ўсім мерапрыемствам стаяла тытанічная супольная праца.

Што станецца з фестывалем, калі раптам скасуюць беларуска-літоўскую мяжу? Бо без такой штучнай перашкоды гэта, перафразоўваючы Эгле, будзе ўжо не «Be2gether». Але, кажуць арганізатары, фэст будзе праводзіцца і далей. А калі мяжу ўсё ж скасуюць, у гэтым яны пабачаць і сваю невялічкую заслугу.

ФАНАГРАФІЧНЫ АГЛЯД

# УВЕСЬ ГЭТЫ РОК

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**У чаканні чарговых альбомаў лідэраў беларускага року, новых музычных уражанняў і эмоцый, айчынныя слухачы не заўважылі, як надышла сярэдзіна года. Пакуль ім не шанцуе: «N.R.M», «ULIS» ды «Крама», як і іншыя прадстаўнікі «першага эшалону» нацыянальнай рок-сцэны, зацята маўчаць. Мабыць, імкнучыся выгадаць лепшыя часы для сваіх рэлізаў. Бадай, толькі Лявон Вольскі са сваімі альбомамі «Такога няма нідзе» і «Белая яблыня грому» даў слухачам падставу для абмеркаванняў. Але мінулыя паўгода для беларускай рок-сцэны не былі марнымі. Айчынная фанаграфія папоўнілася некалькімі цікавымі альбомамі маладых гуртоў. Пра іх музычныя асаблівасці ў чарговым фанаграфічным аглядзе.**

## Антыгламурны гранж ці гранжавы антыгламур?

У мінулым месяцы гурт «Мутнаевока» запрашаў сваіх прыхільнікаў на прэзентацыю свайго дэбютнага альбома «Пошлы гламур». Нагадаю, што музыканты з'яўляюцца паслядоўнікамі музычнага стылю гранж. У выніку прэзентацыі гэтага дыска каманда здабыла вядомасць у колах прыхільнікаў музычнай альтэрнатывы, а таксама атрымала запрашэнне на ўдзел у некалькіх музычных фэстах. На адным з іх — сёлетніх «Рок за Баброў» у Сілічах — «Мутнаевока» здабыло лаўрэацкае званне.

Усе гэтыя поспехі маладога гурта не дазваляюць не звярнуць увагу на навінку ад «Мутнагавока» — іх альбом «Пошлы гламур». Чым жа прыцягвае ўвагу гурт, які зусім нядаўна дэбютаваў на айчыннай рок-сцэне? Бадай тым, што песні з гэтага дыска напоўнены сапраўднымі пачуццямі і эмоцыямі, няхай з налётам падлеткавага максімалізму. Напрыклад, адна з лепшых лірычных кампазіцый альбому «Мутныя вочы» ў стане захапіць слухача менавіта гэтымі якасцямі. Да таго ж, гітом гэту кампазіцыю робіць яскравы лірычны строй тэксту і меладычнасць, якія так неабходныя, каб песня «пайшла ў народ».

Не малая роля ў стварэнні паўнацэннага вобразу песні адводзіцца вакалісту Яўгену Змушку, які ў песнях гурта «Мутнаевока» імкнецца як мага больш дасканала раскрыць эмацыйны патэнцыял той ці іншай кампазіцыі. На жаль, не ва ўсіх песнях Яўгену гэта ўдаецца: банальна не хапае тэхнічных магчымасцяў рок-вакаліста. Але ў такіх песнях, як «Заўсёды\ніколі» магутны спеў Яўгена ўспрымаецца як арганічнае дапаўненне да інструментальных партый і аранжыровак.

Тэматычна песні гурта «Мутнаевока» малююць падлеткавыя канфлікты з навакольным светам, хоць бывае, што лірыка гурта дастаткова свядома і адэкватна адлюстроўвае душэўны стан лірычнага героя іх песень. Так, у галоўнай кампазіцыі альбома «Пошлы гламур» музыканты задумалі сродкамі рок-музыкі намаляваць вобраз таго, што ўяўляе сабой модны гламур, які так агрэсіўна насаджаецца масавай культурай і СМІ. У песні перапанаўча, з сатырычных пазіцый, разглядаецца штучнасць шкалы жыццёвых каштоўнасцяў некаторых яго адэптаў. Антыгламурная кампазіцыя «Мутнагавока» стварае адпаведны настрой дыска, як і «брудны» гітарны гук гурта, і экспрэсіўны, часам штучны вакал Я. Змушкі...

Адна з «фішак» гурта — выкарыстанне традыцыйнага рок-н-ролу ў гранжавых апрацоўках. Вядома, што рок-н-рол з'яўляецца «стылістычным прататыпам» многіх альтэрнатыўных кірункаў. Вось таму ў такіх песнях, як «Нерэальнае Show», «Сэрца Стук», «Ён не ведаў» слухачы могуць адчуць рок-н-рольны драйв у альтэрнатыўна-гранжавай інтэрпрэтацыі. Хоць на дыску ёсць і такія кампазіцыі («Небасхіл»), якія можна назваць клонамі хітоў некаторых беларускіх каманд, асноўны стрыжань творчасці каманды падаецца арыгінальным і перспектыўным для айчыннай рок-сцэны.

Альбом «Пошлы гламур» ад гурта «Мутнаевока» можна запісаць у актыў маладой сталічнай рок-каманды, што, відавочна, паспрыяе росту папулярнасць гурта. Але вядомасць гурта яшчэ больш узрасце, калі музыканты асэнсуюць свой, няхай сціплы, поспех як стымул для далейшага ўдасканалення, а не як сімптом «зорнай хваробы».

## «Sciana» — асэнсаваная пазітыўнасць

У гэтым годзе музычнае выдавецтва БМАgroup парадавала слухачоў новым рэлізам ад берасцейскага гурта «Sciana» пад назвай «Кропка вяртання». Мне ўжо даводзілася рабіць рэпартажы з канцэртаў гэтай каманды. Тады я звярнуў увагу на іх гранічна «цяжкі» гук і экспрэсіўнае выкананне, хітовасць кампазіцый. Безумоўна, «Sciana» — адзін з заўважных лідэраў рэгіянальнага року, які мае кола прыхільнікаў на сваёй малой радзіме. Але адна з мэтаў альбому «Кропка вяртання» — зрабіць гурт «Sciana» нашмат больш вядомым па ўсёй Беларусі, вывесці каманду ў лідэры айчыннай альтэрнатыўнай сцэны.

Як жа гэтыя якасці музыкі гурта «Sciana» знайшлі адлюстраванне на іх новым альбоме? Што і казаць, з першага ж трэка музыканты захапляюць увагу слухача. У нейкім сэнсе песня «Кім я быў?» з'яўляецца вельмі важнай для ўдзельнікаў каманды. Тэкст песні напоўнены дзіўнымі алюзіямі: «Чорныя песні менскага гета/ Ужо не ўзгадаць на вяршынях Тыбета./ Лёгка забыць катынскія ямы/ Тыграм вызвалення Таміл-Іламу...» (аўтар А. Клімус). Пакладзеныя на магутныя рок-рыфы, гэтыя радкі набываюць даволі выразны і зразумелы сэнс, які звернуты да сучасных рэалій нашага жыцця.

Адна з тых песень, якая прынесла вядомасць берасцейцам, — «2000000», прыйшлася да густу сталічным слухачам. Рытмічна яна больш складаная і разнастайная, у тым ліку таму, што ў ёй гучыць «фірмовая» фішка гурта — саксафон Яўгена Лук'янчыка. Спробай адыйсці ад «цяжкіх» матрыц у кампазіцыях гурта «Sciana» з'яўляецца пазітыўная песенька «Сьлёзы пад дажджом», у якой даволі яскрава малюецца магчымасці выбару ў рок-н-рольным свеце.

Не цураюцца музыканты ў сваіх кампазіцыях і нечаканых для рок-музыкантаў філасофскіх тэм. Адна з іх — «Мяне не існуе» — смелая алюзія на вядомы тэзіс беларускага філасафа В. Акудовіча «Мяне няма...». Тым не менш, дзякуючы разнастайным вакальным прыёмам фронтмэна гурта «Sciana» Паўла Прохарава, шматсэнсоўныя радкі песні знаходзяць гармонію з «цяжкай» музыкай гурта.

Такімі ж філасофскімі якасцямі насычаны і шмат іншых кампазіцый альбому. Звярніце ўвагу на трэкі «Сірэны Тытану», «Ніколі болей», «Адам». Галоўная іх асаблівасць — пазітыўнасць і імкненне пазбавіцца штучнага «смуру», якім некаторыя вядомыя гурты імкнуцца прыхаваць сваю творчую безнадзейнасць. Мо таму завяршаючая кампазіцыя «Працяг будзе!» успрымаецца як праграмны твора адносна ўсяго альбому. Ім берасцейскія музыканты акрэслілі свае лідэрскія амбіцыі як аднаго з яскравых прадстаўнікоў рэгіянальнага рокруху Беларусі.

## «Porna» без амаральнасці

Перш чым пачаць размову пра новы альбом «Porna» магілёўца Яна Маўзера і гурта «Mauzer», варта ўспомніць поспех папярэдняй працы артыста, кружэлкі «Радасьць» з магутным хітамі «Брудная вада», «Калыханка», «Беларусь будзе вольнай». Здаецца, плынь часу вярнуць нельга, як і нельга вярнуць былога поспеху. Але на гэта ў Яна свае аргументы, які слухачы знойдуць на новым альбоме выканаўцы.

Як і першы альбом гурта «Радасць», дыск «Porna» не можа не захапіць дасканаласцю запісу, арыгінальнасцю (прынамсі для беларускіх выканаўцаў) аранжыровак і паэтычных эксперыментаў Яна, які з'яўляецца аўтарам лірыкі да кампазіцый «Porna». Не часта айчынныя музыканты так сур'ёзна ставяцца да якасці сваіх запісаў: удзельнікі гурта «Mauzer» запісвалі ўсе партыі гітар, барабанаў, баса, клавішных, вакалу на асобных студыях, а зводзілі і «майстравалі» ўвесь музычны матэрыял на сваёй студыі «MAUZER recordings». Мо таму дыск успрымаецца як новае слова ў мастацтве запісу музычных трэкаў.

**Не часта айчынныя музыканты так сур'ёзна ставяцца да якасці сваіх запісаў: удзельнікі гурта «Mauzer» запісвалі ўсе партыі гітар, барабанаў, баса, клавішных, вакалу на асобных студыях**

Як заўсёды, на гукавых дарожках новага альбома ёсць песні сацыяльнага зместу з палітычным падтэкстам (напрыклад, «Гебельс» ці «Uvaha!»), гранічна шчырыя лірычныя споведзі («Вазьмі мяне», «Балянсу белага» і іншыя), цікавыя інструментальныя замалёўкі («Нараджэньне»).

Толькі на альбоме «Porna» гэтыя песні адрозніваюцца больш дасканалай прапрацоўкай тэмы, больш глыбокім спалучэннем мелодыі і тэксту. Слухачоў папросту захапляюць цяперашнія магчымасці Яна як вакаліста. Здаецца, Маўзеру пад сілу і стварэнне напружнай эмацыянальнасці («Усьміхніся»), і шчырая спавядальнасць («Апошняя песьня»). Мо таму гэтыя кампазіцыі адразу становяцца хітамі, якія слухачы канцэртаў гурта «Mauzer» спяваюць разам з Янам.

Безумоўна, феномену «Mauzer'а» не магчыма было спраўдзіцца без таленавітых і прафесійных удзельнікаў гурта (некаторыя з іх, на жаль, па розных прычынах пакінулі каманду), яны надалі новаму альбому гурта глыбіні і самавітасці. Ім пад сілу і арыгінальныя электронныя эксперыменты, як гэта адчуваецца ў песні «Мора», і сучасны гітарны рок, які дамінуе ў «Шчасьлівых людзях».

Што тычыцца правакацыйнасці «Porna», то сэнс назвы новага альбома гурта «Mauzer» тлумачыць сам Ян Маўзер: «Мы маем на ўвазе не фізіялагічнае порна, хоць да гэтага таксама, напэўна, гэтыя назва адносіцца. Мы хацелі выказаць не тое, што порна вакол, а тое, што порна ўнутры нас. Пра чарнату душы. Мы спадзяёмся, што людзі, якія будуць слухаць альбом, адчуюць тыя думкі, якія былі ўкладзены ў яго змест».

І яшчэ адна вартая ўвагі асаблівасць альбома «Porna» — нават самы заўзяты прыхільнік роднай мовы не знойдзе і дзвюх сэнсавых і арфаграфічных памылак у тэкстах гурта, якія выдрукаваны на буклеце альбому. Такая пісьменнасць сучасных беларускіх рок-музыкантаў не можа не радаваць!









▸ ТУРНЭ

# ЛЕГЕНДА, ЯКУЮ ЗАВУЦЬ ЭЛТАН ДЖОН

Генадзь КЕСНЕР

**Вечар 26 чэрвеня беларускія меламаны будуць помніць доўга — на «Мінск-Арэну» выйшаў Артыст, прыезду якога чакалі тысячы людзей рознага ўзросту, розных светапоглядаў, але якіх аб'ядноўвае адно — любоў да добрай і якаснай музыкі. Карацей, у Беларусі выступіў сам сэр Элтан Джон (Рэджынальд Кенет Дуайт)!**



Майстар прыехаў у Мінск у межах сусветнага турнэ «Elton John's Rocket Man Greatest Hits Tour». Беларусь, дарэчы, стала адзінай краінай з усяго СНД, дзе выступіў Элтан Джон падчас гэтага свайго туру.

У агромністай шматтысячнай зале «Мінск-Арэны», нягледзячы на даволі высокія па беларускіх мерках кошты (некаторыя квіткі каштавалі па пару соцень долараў у пераліку, а то і болей), свабодных месцаў амаль не было. На канцэрт прыехалі гледачы не толькі з розных раёнаў Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі.

Сэр Элтан Джон, у адрозненне ад іншых артыстаў (як айчынных, так і замежных), што ўжо прывучылі публіку да сама мала паўгадзінных зацягванняў свайго выхаду на подыум, быў даволі пунктуальным. Ён вытрымаў «джэнтльменскую» пятнаццаціхвілінную паўзу, таму што не ўсе гледачы паспявалі своечасова заняць свае месцы. Акурат незадоўга да пачатку канцэрта сталіца Беларусі ў літаральным сэнсе паплыла ў выніку наймацнейшай зліва, і даехаць да «Мінск-Арэны» было сапраўдным выпрабаваннем. Недзе ў 20.15 Маэстра літаральна ўзляцеў на сцэну, і панеслася…

Элтан Джон, які выглядаў як заўсёды густоўна і бездакорна (ён быў апрануты ў цёмны стразаваны фрак, з-пад якога выглядала валошкавага колеру кашуля), адразу скіраваўся да любімага раяля, які музыкі заўжды возяць з сабой (дарэчы, як і ўсё іншае абсталяванне), і ўжо праз пару-тройку секунд стала зразумела, што перад публікай — выбітны кампазітар, спявак і піяніст. Аператары, якіх Элтан Джон таксама прывёз з сабою, працыравалі на спецыяльныя вялікія экраны не толькі твар выканаўцы, але яго пальцы, якія віртуозна лёталі па клавішах. Сам Маэстра час ад часу ўскокваў на крэсла ці на раяль, сядаў на яго, боўтаючы нагамі, стукаў кулачкамі сабе ў грудзі, карацей, паводзіў сябе як малое дзіця (праўда, такіх момантаў было не так ужо і багата).

Як і абяцалі арганізатары канцэрту, сэр Элтан Джон выканаў усе свае найлепшыя хіты, якія ён напісаў за сорак гадоў. «Goodbye Yellow Brick Road», «Can You Feel The Love Tonight», «Sorry seems to be the hardest word», «I Guess That's Why They Call It the Blues», «Believe», старэнькая «Crocodile Rock» і многія іншыя кампазіцыі ў публіцы проста «зрывалі дах». Сам жа Майстар працаваў без перапынку, толькі пасля кожнай песні прыгубляючы вады з агромністага грааля, каб крыху прамачыць напрацаванае горла.

Моц голасу, неверагоднае валоданне інструментам (раялем), шалёная энергетыка і мацнейшая харызма, чароўная мелодыка многіх яго кампазіцый — асноўныя складнікі сусветнага поспеху сэра Элтана Джона. Музыкі, якога маюць за гонар прыняць у сябе і каранаваныя асобы, і прэзідэнты, і прэм'еры многіх краінаў. А публіка на яго канцэртах папросту шалее, і Мінск у гэтым сэнсе не стаў выключэннем.

Відаць, сам Маэстра адчуў адваротную энергетыку з боку сваіх беларускіх фанатаў, бо пасля завяршэння канцэрту выйшаў да іх у залу, прыняў велізарныя букеты сваіх любімых ружаў, і, што па словах адмыслоўцаў ёсць увогуле неверагодным для Элтана Джона, пачаў раздаваць аўтографы, а з адным хлапчуком нават сфатаграфаваўся наўпрост на сцэне і распісаўся на ягонай майцы. Вось пашчасціла юнаку!

Хай бы на гэты канцэрт завітаў спадар Чаргінец, які збіраўся запатрабаваць запісы папярэдніх выступаў Элтана Джона на прадмет адпаведнасці яго творчасці і вобліку выканаўцы нормам беларускае маралі! Ды не будзем пра сумнае…

Упершыню не хацелася ісці дадому пасля такога даволі працяглага (амаль дзве з паловай гадзіны!) канцэрту. Давялося прызнацца самому сабе, што такога ўзроўню я яшчэ не бачыў, хоць даводзілася бываць на розных фестывалях, у тым ліку на буйных міжнародных з удзелам сапраўдных сусветных зорак. Элтан Джон узняў у Мінску планку на такую вышыню, што дацягнуцца да яе цяпер камусьці іншаму будзе вельмі цяжка. Таму цяпер некалькі разоў падумаеш перад тым, як ісці на яшчэ які-небудзь канцэрт. Бо ад вечара 26 чэрвеня ўзровень прафесіяналізму выканаўцаў многія гледачы будуць вымяраць у «Элтанах Джонах».

▸ ФЕСТЫВАЛЬ

# РАЗДАРОЖЖА БЕЛАРУСКАГА КІНО

Алесь ЛАПО

**VII Рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў, які прымаў Брэст, падвёў вынікі трохгадовага існавання беларускай кінаіндустрыі і выявіў дзве характэрныя тэндэнцыі ў сучасным беларускім мастацтве кіно: арыентацыя на савецкія ідэалагічныя здабыткі тут спалучаюцца са спробамі выпрацаваць нацыянальную кінаэстэтыку.**

## Апошні ўздых савецкага кінематографа

Матывы савецкага кіно найбольш яскрава адбіваюцца ў стужках расійскіх кінарэжысёраў, якія па розных прычынах вымушаны працаваць на беларускай кінастудыі.

Паказальнай у гэтым плане і самай гучнай падзеяй сёлетняга кінафестывалю стала сусветная прэм'ера беларуска-расійскага блакбастэру «Брэсцкая крэпасць». Прэзентацыя фільма адбылася ў мурах гераічнай крэпасці ў ноч з 21 на 22 чэрвеня: на гэты напаўзакрыты паказ трапіла каля 500 гледачоў — астатнія мусяць чакаць лістапада, калі кінастужка выйдзе ў шырокі пракат.

Стваральнікі фільма рэпрэзентуюць яго як кінарэканструкцыю: сюжэт фільма пабудаваны на сапраўдных падзеях абароны Брэсцкай крэпасці і лёсах рэальных удзельнікаў баявых дзеянняў. Адзіным выключэннем з'яўляецца вобраз чатырнаццацігадовага хлопчыка Сашы Акімава, які ў лепшых традыцыях савецкага дзіцячага кіно здзяйсняе геранічныя ўчынкі: дастаўляе ваду пакутуючым ад смагі абаронцам, наладжвае сувязь паміж ачагамі супраціўлення, выратоўвае ад смерці сяброўку, — і застаецца жывым.

Падкрэсленая арыентацыя фільма на сярэдні школьны ўзрост падаецца непрымальнай. Стральба, выбухі, забойствы, кроў, адарваныя часткі цела робяць фільм цяжкім для дзіцячага ўспрымання і патрабуюць узроставага абмежавання для гледачоў.

Рэжысёр фільма Аляксандр Кот напярэдадні прэм'еры казаў, што марыў зняць савецкае кіно, што цалкам атрымалася ў ідэалагічным плане, па форме ж фільм нагадвае хутчэй галівудскі блакбастэр.

Канкурэнцыю «Брэсцкай крэпасці» ў барацьбе за савецкую кінаспадчыну склаў другі пазаконкурсны фільм беларуска-расійскай вытворчасці «Вока за вока» Генадзя Палокі. Выканаўца адной з галоўных роляў Уладзімір Гасцюхін адзначыў, што гэтая кінакарціна — «апошні ўздых, апошні вялікі шэдэўр савецкага кінематографа».

Савецкі мастацка-ідэалагічны ўхіл праявіўся яшчэ ў некалькіх конкурсных фільмах, асабліва ў «Дняпроўскім рубяжы», дзе ён злучыўся з аўтарскім дылетантызмам. Фільм, прысвечаны абароне Магілёва ў 1941 годзе, стаўся адным з самых няўдалых у гісторыі беларускага кінематографа ў фінансавым плане: пры выдаткаваннях у больш чым 6 мільярдаў рублёў, яго прыбыткі не перавысілі 100 мільёнаў.

## Нацыянальны твар беларускага кіно

Кіраўнік Мінкульту Павел Латушка ў студзені адзначыў, што ніводны зроблены за апошні час беларускі фільм не адпавядаў характарыстыцы «нацыянальны», а менавіта на гэта трэба рабіць ухіл у далейшым. Сказанае не датычыць беларускай кінадакументалістыкі і анімацыі, якія, у адрозненні ад мастацкага кіно, маюць пад сабой трывалы нацыянальны падмурак.

Праграма дакументальнага кіно вызначалася вялікай колькасцю нацыянальна арыентаваных твораў. За адсутнасцю лепшай беларускай дакументальнай стужкі трохгоддзя, пераможцы шматлікіх фестываляў «Ва ўсе дні» М. Жданоўскага, галоўнай узнагародай быў адзначаны фільм «Сэрца перамогі» М. Князева. Праўда, цікавасць у брэсцкай публікі да конкурсу дакументальнага кіно адсутнічала: на праглядзе фільма-пераможцы, прысвечанага жыццю беларускага партызана Міная Шмырова, акрамя аўтара гэтых радкоў, прысутнічалі тры чальцы журы і кінамеханік.

На захаванне беларускай духоўнай спадчыны працуе і анімацыйная студыя кінафабрыкі. Больш за палову беларускіх мультыплікацыйных стужак выходзіць на беларускай мове і прысвечана нацыянальным культурным здабыткам. Актыўна выкарыстоўваецца практыка стварэння шматсерыйных фільмаў, якія прысвечаны гісторыі паходжання беларускіх гербаў («Аповесць мінулых гадоў»), народнай песеннай культуры («Музычная скарбонка»), стварэнню нацыянальнага анімацыйнага героя («Несцерка»). Сярод індывідуальных работ вылучаецца анімацыя М. Тумелі ў стылістыцы выцінанкі і фільм Ленкіна «Птаха», дзе ствараецца лірычны вобраз вясковага старога самотніка.

У беларускім мастацкім кіно ўжо чвэрць стагоддзя доўжыцца змена пакаленняў, і на сённяшні дзень відавочна станоўчая тэндэнцыя: на кінастудыі працуюць яскравыя рэжысёры (А. Колбышаў, А. Кудзіненка, Р. Грыцкова), пашыраецца жанравая складаючая айчыннага кіно (ад псіхалагічнай драмы да трымценніка) і адбываецца зварот да нацыянальнай тэматыкі. Старшыня журы кінафестывалю эстонскі рэжысёр Пеэтер Сім адзначыў, што «беларускае кіно вельмі разнабаковае і пры гэтым мае свой нацыянальны твар», і перадаў Гран-пры найбольш «цэласнаму сярод беларускіх фільмаў» — кінакарціне «Ваўкі» Аляксандра Колбышава.

**Узнагароды VII Рэспубліканскага кінафестывалю беларускіх фільмаў**

Гран-пры: «Ваўкі» (2010; рэж. А. Колбышаў)
Лепшы фільм: «Інсайт» (2009; рэж. Р. Грыцкова)
Лепшая рэжысура: А. Колбышаў («Ваўкі»)
Лепшы дакументальны фільм: «Сэрца перамогі» (2009; рэж. М. Князеў)
Лепшы анімацыйны фільм: «Аповесць мінулых гадоў» (маст. кіраўнік І. Волчак)

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 615

Падпісана да друку 02.07.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.